Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 САКАВІКА 2018 г. ЧАЦВЕР № 50 (28666)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**Законнасць, роўнасць і народаўладдзе**

*Дарагія суайчыннікі!*

*Віншую вас з Днём Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.*

*З Асноўным Законам, які замацаваў важнейшыя прынцыпы ўладкавання грамадства і дзяржавы, звязана рэалізацыя такіх каштоўнасцяў, як законнасць, роўнасць, справядлівасць і народаўладдзе.*

*Умацаванне суверэннай дзяржаўнасці, дасягненне грамадскай згоды і сацыяльна-палітычнай стабільнасці непарыўна звязаны з канстытуцыйным правам беларускага народа вызначаць свой лёс і прымаць найбольш важныя рашэнні.*

*Упэўнены, што і ў далейшым удасканаленне канстытуцыйнай дэмакратыі, якое адпавядае сучасным патрэбнасцям развіцця Рэспублікі Беларусь, павінна будавацца ў першую чаргу з улікам інтарэсаў як асобнага чалавека, так і грамадства ў цэлым.*

*Шчыра жадаю ўсім суграмадзянам здароўя, шчасця і поспехаў ва ўсіх пачынаннях на карысць нашай Радзімы.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр СУБОЦІН, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Віцебскай вобласці:**

*«Выязныя прыёмы важныя для грамадзян. Не ўсе могуць дабрацца да Віцебска або Мінска, і вельмі добра, што кіраўнікі розных рангаў ездзяць па рэгіёнах. Так мы атрымліваем поўны зрэз вострых праблем, якія назапасіліся на месцах. Многія пытанні вырашаюцца, не даходзячы да ўзроўню памочніка Прэзідэнта. Але ёсць людзі, якім прынцыпова важна расказаць пра хвалюючую праблему губернатару або прадстаўніку Прэзідэнта ў рэгіёне. І такія непасрэдныя зносіны маюць каштоўнасць для двух бакоў».*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 4° |
| Віцебск | - 1° |
| Гомель | + 1° |
| Гродна | + 2° |
| Магілёў | - 1° |
| Мінск | + 1° |

# Цяпло чалавечай рукі



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ З нагоды

## МУЗЕЙ, АЛЕЯ КІНО І ПЛЯЦОЎКІ АГЛЯДУ

### Якія аб'екты з'явяцца і застануцца ў Гродне пасля фестывалю этнічных культур

**Чарговы, 12-ы па ліку, Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур пройдзе ў Гродне ў пачатку чэрвеня. Стала традыцыйным рыхтаваць да свята адкрыццё цікавых аб'ектаў. Сёлета іх, дарэчы, будзе больш, чым у мінулыя гады. Аб гэтым падчас пасяджэння рабочай групы паведамілі арганізатары фестывалю.**



У цэнтры Гродна з'явіцца музей фестывалю. Тут будуць прадстаўлены галоўныя прызы, сувеніры, падарункі гасцей, сабраныя за 20-гадовы перыяд правядзення свята, нямала ўнікальных экспанатаў гатовы даць нацыянальныя суполкі. У гэтым жа будынку на адным з паверхаў будзе размешчана экспазіцыя архітэктуры Гродна. Адну залу зойме выстаўка карцін. І першай экспазіцыяй стануць работы ўдзельнікаў міжнароднага пленэру мастакоў «Гродна — дарог скрыжаванне», які пройдзе напярэдадні фестывалю.

СТАР. 4

■ Спецыяльны рэпартаж

## КРАЙ ШТУЧНЫХ ГОР

### Куды ў вялікім горадзе вывозяць сабраны снег

**Дзясяткі магутных грузавікоў выходзяць на вуліцы Мінска. Іх мэта — забраць кучы снегу, якія ўтварыліся пасля расчысткі тратуараў, праезнай часткі і прыпынкаў грамадскага транспарту, і адвезці іх на спецыялізаваны палігон. Там, нікому не замінаючы, яны будуць пакрысе таяць. Адметна, што такія палігоны знаходзяцца непасрэдна ў межах сталіцы. Як правіла, гэта месцы незаўважныя, дзе, як гаворыцца, чужыя не ходзяць. Напрыклад, у Фрунзенскім раёне сталіцы сёлета снег звозяць на тэрыторыю былой вайсковай часці. Карэспандэнты «Звязды» выправіліся ў царства снегавых гор.**

Адліга, якая ў пачатку тыдня накрыла сталіцу, дабралася і да палігона. Праўда, калі ў дварах газоны яшчэ пакрыты бялюткім (хоць ужо і рыхлым) снегам, то гэтае ўражанне на тэрыторыі звалкі прападае адразу пры ўездзе. З-пад ног пры кожным кроку разлятаецца сумесь вады, мокрага снегу і пяску. Ды і перад намі высяцца не белыя горы, дзе працуюць машыны, а глыбы ў чорна-шэра-белай расфарбоўцы. Вышыня іх розная — ад невялікіх гурбаў і да горак у пяць-шэсць метраў.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ І ВЫЙГРАЙ КАРЫСНЫЯ ПРЫЗЫ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на II квартал 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# КАНСТЫТУЦЫЯ — АСНОЎНЫ ЗАКОН ГРАМАДСТВА І ДЗЯРЖАВЫ

**15 сакавіка — Дзень Канстытуцыі, адно з галоўных свят суверэннай беларускай дзяржаўнасці. У гэты дзень у 1994 годзе шляхам усенароднага рэферэндуму была прынята Канстытуцыя незалежнай Беларусі. У ёй увасобіліся духоўныя і прававыя каштоўнасці беларускага народа, агульнапрызнаныя дзяржаўна-прававыя ідэі ўсяго чалавечага грамадства. Са змяненнямі і дапаўненнямі, прынятымі на рэспубліканскіх рэферэндумах, якія адбыліся ў 1996 і 2004 гадах, амаль чвэрць стагоддзя Канстытуцыя з'яўляецца Асноўным Законам грамадства і дзяржавы.**

Упершыню ў гісторыі беларускай дзяржавы чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі абвешчаны найвышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы, замацаваны абавязак дзяржавы выконваць іх і абараняць. Канстытуцыйна-прававому статусу чалавека прысвечана больш як палова артыкулаў Канстытуцыі. Яны прадугледжваюць, што дзяржава гарантуе правы і свабоды грамадзян Беларусі, замацаваныя ў Канстытуцыі, законах і прадугледжаныя міжнароднымі абавязацельствамі дзяржавы, забяспечвае свабоду, недатыкальнасць і годнасць асобы.

Згодна з Канстытуцыяй, дзяржаўныя органы, службовыя і іншыя асобы, якім даверана выкананне дзяржаўных функцый, абавязаны ў межах сваёй кампетэнцыі прымаць неабходныя меры для ажыццяўлення і абароны правоў і свабод асобы. Прадугледжана таксама адказнасць грамадзяніна за няўхільнае выкананне сваіх канстытуцыйных абавязкаў. Прынцып узаемнай адказнасці грамадзяніна і дзяржавы складае аснову балансу канстытуцыйных каштоўнасцяў.

Гэтыя і іншыя палажэнні Канстытуцыі выступаюць моцнай прававой асновай свабоднага і годнага развіцця чалавека. На дзесяцігоддзі ўперад яны сталі вызначальным крытэрыем дзейнасці дзяржавы, усіх яе органаў, інстытутаў грамадзянскай супольнасці.

Канстытуцыя вызначае ўстоі дзяржаўна-прававой сістэмы Рэспублікі Беларусь, абвяшчае яе дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавай, у якой народ з'яўляецца адзінай крыніцай дзяржаўнай улады і носьбітам суверэнітэту.

У адпаведнасці з Канстытуцыяй, дэмакратыя ў Рэспубліцы Беларусь дзейнічае на аснове разнастайнасці палітычных інстытутаў, ідэалогій і поглядаў. Свабода поглядаў, перакананняў і іх свабоднае выказванне, права на свабоду аб'яднанняў гарантуюцца кожнаму. Грамадзяне Рэспублікі Беларусь маюць права ўдзельнічаць у вырашэнні дзяржаўных спраў як непасрэдна, так і праз свабодна выбраных прадстаўнікоў.

На аснове Канстытуцыі ўмацоўваецца сацыяльная дзяржава. Канстытуцыйныя прынцыпы і нормы вызначаюць патрэбнасці чалавека ў годным жыцці і развіцці ў якасці мэты функцыянавання ўсіх формаў уласнасці, сацыяльных інстытутаў. У Рэспубліцы Беларусь ахоўваецца здароўе грамадзян, гарантуюцца правы на працу і адпачынак, адукацыю, сацыяльнае забеспячэнне, спрыяльнае навакольнае асяроддзе, на ўдзел у культурным жыцці. Пад абаронай дзяржавы знаходзяцца шлюб, сям'я, мацярынства, бацькоўства і дзяцінства. У мэтах паляпшэння ўмоў жыцця ажыццяўляецца кантроль за рацыянальным выкарыстаннем прыродных рэсурсаў. Адпаведныя напрамкі дзейнасці сацыяльнай дзяржавы рэалізуюцца згодна з прынцыпам сацыяльнай справядлівасці, сацыяльнай абароненасці і сацыяльнай салідарнасці.

У Рэспубліцы Беларусь як прававой дзяржаве зацвярджаецца вяршэнства права. Канстытуцыя з'яўляецца актам прамога дзеяння і замацоўвае асноватворныя прынцыпы і нормы рэалізацыі важнейшых грамадскіх адносін. Дзяржава, усе яе органы і службовыя асобы дзейнічаюць у межах Канстытуцыі і прынятых у адпаведнасці з ёю актаў заканадаўства. Паслядоўнае развіццё канстытуцыйных прынцыпаў і каштоўнасцяў у заканадаўстве забяспечвае такія яго важнейшыя ўласцівасці, як легітымнасць і сацыяльная прымальнасць. Яны спрыяюць гарманізацыі грамадства, трываламу функцыянаванню грамадзянскай супольнасці і публічнай улады.

Канстытуцыя з'яўляецца галоўнай прававой апорай незалежнай і суверэннай дзяржавы Рэспубліка Беларусь, правоў і свабод яе грамадзян, прагрэсіўнага развіцця грамадства і дзяржавы.

Зацвярджэнне замацаваных у Канстытуцыі фундаментальных каштоўнасцяў забяспечваецца канстытуцыйна-прававымі механізмамі яе выканання і абароны. Гарантам Канстытуцыі, правоў і свабод чалавека і грамадзяніна з'яўляецца Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь. У мэтах рэалізацыі канстытуцыйных палажэнняў парламентам Рэспублікі Беларусь прымаюцца законы. Выкананне Канстытуцыі забяспечваецца ўрадам Рэспублікі Беларусь. На аснове Канстытуцыі і прынятых у адпаведнасці з ёю іншых нарматыўных актаў ажыццяўляюць правасуддзе суды.

Кантроль за канстытуцыйнасцю нарматыўных актаў у дзяржаве ажыццяўляецца Канстытуцыйным судом Рэспублікі Беларусь. Рэалізуючы свае паўнамоцтвы, Канстытуцыйны суд забяспечвае вяршэнства Канстытуцыі і яе непасрэднае дзеянне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, абарону канстытуцыйнага ладу, канстытуцыйных правоў і свабод грамадзян. У пасланні «Аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь у 2017 годзе», адрасаваным Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і палатам Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Канстытуцыйны суд адзначыў, што забеспячэнне канстытуцыяналізацыі грамадскіх адносін з'яўляецца абавязкам усіх дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў, службовых асоб і грамадзян.

Нязменнасць ролі Канстытуцыі як Асноўнага Закона грамадства і дзяржавы пацвярджае прыхільнасць народа Беларусі да канстытуцыйных каштоўнасцяў, яго імкненне рэальна сцвярджаць правы і свабоды чалавека і грамадзяніна, устоі народаўладдзя і прававой дзяржавы, паслядоўна садзейнічаць станаўленню кожнага грамадзяніна як носьбіта канстытуцыйных правоў, свабод і абавязкаў, актыўнага ўдзельніка канстытуцыйных адносін.

**Наталля КАРПОВІЧ,**
**намеснік старшыні**
**Канстытуцыйнага суда**
**Рэспублікі Беларусь,**
**доктар юрыдычных навук.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Меркель зноў стала канцлерам Германіі



Лідар партыі Хрысціянска-дэмакратычны саюз (ХДС) Ангела Меркель чацвёрты раз запар абрана бундэстагам на пасаду кіраўніка ўрада Германіі. Пра гэта паведамляе Reuters. У ходзе галасавання на пасяджэнні парламента яна атрымала неабходную большасць для перавыбрання. У яе падтрымку выступілі 364 дэпутаты, супраць — 315, яшчэ дзевяць устрымаліся. Меркель упершыню стала канцлерам у лістападзе 2005-га. На цяперашні момант яна займае гэты пост на працягу 12 гадоў і 112 дзён. Выбары канцлера адбыліся пасля фарміравання ў лютым кааліцыйнага ўрада па выніках выбараў 2017 года ў бундэстаг. Тады блок ХДС і ХСС (Хрысціянска-сацыяльны саюз) пад кіраўніцтвам Меркель дасягнуў кампрамісу на перамовах з Сацыял-дэмакратычнай партыяй Германіі (СДПГ).

### Памёр Стывен Хокінг

Сусветна вядомы брытанскі фізік Стывен Хокінг памёр на 77-м годзе жыцця, як паведамляе The Guardian. Гэтую інфармацыю пацвердзіла сям'я навукоўца. Шырокую вядомасць Хокінг атрымаў пасля таго, як у красавіку 1988 года была апублікавана яго навукова-папулярная кніга «Кароткая гісторыя часу». Яна перакладзена на дзясяткі моў і выдадзена агульным накладам больш за 10 мільёнаў асобнікаў. Галоўнае навуковае дасягненне Хокінга звязана з апісаннем выпраменьвання чорных дзір. Большую частку жыцця фізік правёў у інвалідным калясцы.

### Прэзідэнт Філіпін абвясціў аб выхадзе з Міжнароднага крымінальнага суда

Прэзідэнт Філіпін Радрыга Дутэртэ абвясціў пра адкліканне ратыфікацыі краінай Рымскага статута, які заснаваў Міжнародны крымінальны суд (МКС). Пра гэта паведамляла агенцтва France-Presse. У лютым пракуратура МУС прыняла рашэнне пачаць папярэдняе вывучэнне сітуацыі на Філіпінах. Як заявіла пракурор Фату Бенсуда, будуць прааналізаваныя «магчымыя злачынствы, учыненыя з 1 ліпеня 2016 года ў кантэксце кампаніі па барацьбе з распаўсюджваннем наркотыкаў, запушчанай урадам краіны». Паводле яе звестак, тысячы чалавек былі забітыя за ўжыванне або продаж наркотыкаў, прычым у некаторых выпадках гаворка ідзе пра забойствы без суда і следства ў ходзе паліцэйскіх аперацый.

### Сусветны рынак твораў мастацтва вырас да $63,7 млрд



Аб'ём сусветнага рынку твораў мастацтва летась вырас на 12 працэнтаў і дасягнуў $63,7 млрд. Пра гэта гаворыцца ў апублікаваным штогадовым дакладзе, падрыхтаваным па замове швейцарскага банка UBS і міжнароднага кірмашу твораў мастацтва Art Basel. Рост сусветнага артрынку быў дасягнуты пасля двух гадоў падзення яго аб'ёму.

Значная доля сусветных продажаў (83 %) прыпадае на тры краіны, якія з'яўляюцца найбуйнейшымі рынкамі твораў мастацтва. На першым месцы стаяць ЗША (42 % кошту здзелак на глабальным рынку), Кітай (21 %) па выніках года выйшаў на другое месца, адціснуўшы на трэцяе Вялікабрытанію (20 %). Рухальнай сілай рынку ў 2017-м сталі звышдарагія творы мастацтва, такія як, напрыклад, карціна Леанарда да Вінчы «Збаўца свету», прададзеная на лістападаўскім аўкцыёне Christie's у Нью-Ёрку за $450 млн.

■ Парламенцкі дзённік

# ШАЎКОВЫ ШЛЯХ І IT

**Пра гэта і не толькі — у тыднёвым аглядзе падзей у Палаце прадстаўнікоў**

Дэпутаты разам з супрацоўнікамі Адміністрацыі Парка высокіх тэхналогій абмеркавалі **перспектывы развіцця лічбавай эканомікі** ў сувязі з падрыхтоўкай да разгляду Дэкрэта № 8. Намеснік дырэктара па прававых пытаннях Адміністрацыі ПВТ Іван Жызнеўскі расказаў, што летась аб'ём вытворчасці праграмнага забеспячэння і IT-паслуг перавысіў $1 млрд. Пры гэтым каля 1 млрд людзей у больш чым 150 краінах карыстаюцца мабільнымі праграмамі, створанымі ў ПВТ. Асноўныя напрамкі дэкрэта накіраваны ў тым ліку на працяг спецыяльнага прававога рэжыму Парка да 2049 года і на новыя віды дзейнасці рэзідэнтаў. Гэта і кіберспорт, і блокчэйн, і штучны інтэлект. «Сіліконавая даліна Усходняй Еўропы», як Беларусь пачалі называць з канца мінулага года, можа стаць рэгіянальным лідарам па некаторых напрамках. Іван Жызнеўскі расказвае, што на днях было зарэгістравана 46 новых рэзідэнтаў ПВТ. Пры гэтым за ўвесь 2017 год — 33. Гэта пэўны індыкатар таго, што наша краіна становіцца ўсё больш цікавым цэнтрам для развіцця IT-індустрыі.

На пачатку тыдня Пастаянная камісія Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы абмеркавала **змяненні законаў, якія датычацца донарства крыві і яе кампанентаў.** У пасяджэнні рабочай групы, акрамя дэпутатаў, прынялі ўдзел спецыялісты Міністэрства аховы здароўя і Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Беларусі. Разам яны абмеркавалі пытанні ўмоў і парадку выканання донарскай функцыі, рэалізацыі, увозу ў краіну і вывазу крыві і яе кампанентаў. Асобным пытаннем стаяла вызначэнне правоў, абавязкаў і гарантый донараў. Работа па падрыхтоўцы законапраекта будзе працягнута.

На гэтым тыдні ў Баку прайшла міжнародная канферэнцыя **«Роля парламентарыяў у актывізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і культурных сувязяў уздоўж Шаўковага шляху».** Намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Баляслаў Пірштук выступіў на ёй па тэме развіцця ўзаемавыгаднага эканамічнага супрацоўніцтва і гандлёвых сувязяў. Ён адзначыў, што ініцыятыва стварыць групу падтрымкі Шаўковага шляху ў Парламенцкай асамблеі АБСЕ ў рамках летняй сесіі ў Мінску была своечасовай: яна дала дадатковы інструмент для ўзаемадзеяння ў такіх важных напрамках, як умацаванне суверэнітэту, бяспека і эканамічнае развіццё.

Акрамя таго, Баляслаў Пірштук правёў у Азербайджане шэраг двухбаковых сустрэч. Са старшынёй Парламенцкай асамблеі АБСЕ Георгіем Цэрэтэлі і генеральным сакратаром ПА АБСЕ Раберта Мантэлам бакі абмеркавалі ўзаемадзеянне беларускага парламента і Парламенцкай асамблеі АБСЕ. Беларуска-азербайджанскія адносіны сталі тэмай для перагавораў з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Беларусі ў Азербайджане Генадзем Ахрамовічам. У гэтыя ж дні намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў таксама сустрэўся з дэлегацыямі Аўстрыі, Азербайджана, Сербіі, Таджыкістана, Швейцарыі і міністрам замежных спраў Манголіі.

**Надзея АНІСОВІЧ**

■

# Працавалі ў Чэхіі? Маеце права на пенсію

**Беларусь і Чэхія ўчора падпісалі дагавор аб пенсійным забеспячэнні паміж дзвюма краінамі.**

Дагавор распаўсюджваецца на ўсіх, хто жыве і працуе ці працаваў на тэрыторыі Беларусі і Чэхіі. Яго мэтай з'яўляецца забеспячэнне фарміравання пенсійных правоў за перыяды працы на тэрыторыі названых дзяржаў і рэалізацыі гэтых правоў.

Як адзначаюць у Мінпрацы і сацабароны, з падпісаннем гэтага дакумента Беларусь і Чэхія дамаўляюцца рэгуляваць выплату ўнёскаў на абавязковае дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне (пенсійнае забеспячэнне, дапамогу па часовай непрацаздольнасці, дапамогу па цяжарнасці і родах і інш.). Таксама будуць рэгулявацца прызначэнне і выплата пенсій (па ўзросце, за выслугу гадоў, па інваліднасці, з нагоды страты карміцеля).

Паводле дагавора, плацельшчыкі страхавых унёскаў павінны выконваць правілы, што дзейнічаюць у дзяржаве, у якой яны працуюць. Пенсіі будуць прызначацца кожнай дзяржавай у адпаведнасці са сваім заканадаўствам за стаж, набыты на яе тэрыторыі, і выплачвацца на тэрыторыі дзяржавы пражывання грамадзяніна.

У Мінпрацы і сацабароны адзначаюць, што ў цяперашні час вядзецца работа над праектамі такіх дагавораў таксама з Польшчай і Эстоніяй.

**Святлана БУСЬКО.**

■ Ведай нашых!

# «НЕ ТОЛЬКІ ДЗЕЦІ ПАВІННЫ ГАНАРЫЦЦА СВАІМІ БАЦЬКАМІ...»

На свята ў гонар жанчын запрасілі матуль сёлетніх алімпійскіх чэмпіёнак

**З больш як 160 тысяч членаў Беларускага саюза жанчын дзясяткі кемлівых і выдатных прыгажунь — творцаў, навукоўцаў, дактароў, узорных маці — спаборнічалі сёлета за права атрымаць ганаровае званне «Жанчына года — 2017». 42 пераможцы юбілейнага, дзясятага рэспубліканскага конкурсу і сотні гасцей збяруцца ў суботу ў сталіцы на сапраўднае і заслужанае свята.**

Беларускі саюз жанчын заўжды займаўся праблемамі мацярынства і дзяцінства, таму намінацыя «За выхаванне дзяцей і моладзі» прысутнічае штогод. Сёлета, праўда, яна называецца па-іншаму — «Мацярынская слава». У ёй больш актыўна сталі ўшаноўваць не толькі родных матуль, а і тых, хто стаў замяшчальнай маці, апекуном, выхавальнікам, усынавіцелем дзетак.

*— Сёлета адной з умоў вылучэння на ўзнагароджанне ў гэтай катэгорыі была наяўнасць у намінанткі дваіх-траіх дзетак. Прычым такіх, якія праявілі сябе: сталі пераможцамі міжнародных конкурсаў ці алімпіяд, маюць уласнае годнае імя або праславілі маці на ўсю краіну, як гэта зрабіў касманаўт Алег Навіцкі, —* адзначыла **Антаніна МОРАВА, сустаршыня БСЖ.** *— Не толькі дзеці павінны ганарыцца сваімі бацькамі, але і бацькі сваімі дзецьмі. А каб ганарыцца, трэба іх правільна выхаваць, навучыць сябе паводзіць. Гэта і ёсць мацярынская слава.*

Крытэрыі адбору найлепшых прадстаўніц прыгожай паловы сёлета сталі больш сур'ёзныя і дасканалыя і ў іншых намінацыях конкурсу.

*— Намінацыі на працягу ўсяго часу ў той ці іншай ступені мяняюцца ў залежнасці ад таго, якім аб'яўлены год на Беларусі. Летась у краіне быў Год навукі, таму адной з цэнтральных стала «Жанчына ў навуцы», —* расказала Антаніна Морава. *— Сёлета мы таксама пакінулі яе, а да вылучэння лаўрэатаў падышлі вельмі сур'ёзна. Жанчыны-намінанткі павінны былі зрабіць у 2017-м значныя для краіны распрацоўкі.*

Новая намінацыя гэтага года — «Ратуючы жыцці». Раней яна гучала як «За міласэрнасць», і сюды вылучаліся ў асноўным жанчыны з Чырвонага крыжа. Сёлета тут удзельнічалі ў асноўным дактары, хоць кіраўніцтва саюза спадзявалася, што да конкурсу далучацца і жанчыны-ратавальнікі з Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

Прэзідыум БСЖ мае права дадаткова прапанаваць да ўзнагароджання асобу, якая асабліва вызначылася. Сёлета, як мяркуецца, «за вернасць БСЖ» будзе ўзнагароджана старшыня Гомельскай абласной арганізацыі саюза Галіна Пашэд.

Сярод іншых сюрпрызаў, якія абяцаюць гасцям, — святочны канцэрт і спецыяльна запрошаныя маці сёлетніх алімпійскіх чэмпіёнак Беларусі, якім урачыста падзякуюць за поспехі іх таленавітых дзяцей.

**Ірына СІДАРОК.**

# ДЗЕВЯЦЬ ПАРААЛІМПІЙСКІХ МЕДАЛЁЎ

## заваявалі беларусы ў Пхёнчхане

**Наш параалімпійскі дэсант, які высадзіўся ў Паўднёвай Карэі, невялікі. Пятнаццаць атлетаў выступаюць усяго ў двух відах спорту — біятлоне і лыжных гонках. Але наколькі рэзультатыўна!**

Першы залаты медаль на рахунак нашай каманды запісала Святлана Сахоненка ў лыжнай гонцы на 15 кіламетраў вольным стылем сярод спартсменак у катэгорыі для атлетаў з парушэннямі зроку. З гэтым дасягненнем яе павіншаваў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. Ён выказаў упэўненасць, што поспехі Святланы Сахоненкі будуць яркім арыенцірам для нашых спартсменаў, стымулам змагацца і дамагацца значных вынікаў у славу Беларусі.



Фота БЕЛТА.

**На алімпійскай трасе Дзмітрый ЛОБАН.**

Вестка пра тое, што Святлана Сахоненка выйграла другі залаты медаль, прыйшла ўчора. Яна фінішавала першай у фінале на дыстанцыі ў паўтара кіламетра. Акрамя таго, яшчэ ў стартавы дзень Параалімпіяды беларуска стала бронзавым прызёрам у спрынтарскай гонцы на шэсць кіламетраў.

Яшчэ адно «золата» Беларусі прынёс Юрый Голуб. Ён стаў найлепшым у біятлоннай гонцы на дванаццаць з паловай кіламетраў сярод атлетаў з парушэннямі зроку. Да гэтага Юрый Голуб ужо двойчы ўздымаўся на параалімпійскі п'едэстал, выйграўшы «серабро» ў біятлонным спрынце на 7,5 кіламетра і лыжнай гонцы на 20 кіламетраў.

Два сярэбраныя медалі ў капілку беларускай зборнай прынёс Дзмітрый Лобан. Другое месца ён заняў у біятлонным спрынце на 7,5 кіламетра і ў лыжнай гонцы на 1,1 кіламетра. Бронзавы медаль таксама на рахунку біятланісткі Лідзіі Графеевай, якая стала трэцяй у спрынтарскай гонцы.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК**

■ Супрацоўніцтва

# СУСТРЭЧА МЭРАЎ, БІЗНЕС-ФОРУМ І ШАХМАТНЫ ТУРНІР

Дні Мінска пройдуць у Тбілісі

**Шэраг мерапрыемстваў запланаваны на 21—23 сакавіка. Нягледзячы на тое, што пабрацімскія адносіны паміж дзвюма сталіцамі завязаліся не так даўно — у верасні 2015-га, сяброўства можна назваць вельмі цесным. Чаго варта хоць бы тое, што грузінскае народнае свята «Тбілісоба» летась сабрала ў цэнтры Мінска больш за 100 тысяч чалавек.**

Аднак культурны складнік — далёка не адзінае, што звязвае Беларусь і Грузію. Як расказаў **намеснік старшыні Мінгарвыканкама Аляксандр КРЭПАК,** цяпер толькі ў Мінску працуе 14 кампаній з грузінскім капіталам, летась прырост тавараабароту склаў 13,5 %. Падчас Дзён Мінска ў Тбілісі асаблівая ўвага будзе ўдзяляцца эканоміцы. Пройдзе выстава-кірмаш беларускіх вытворцаў, дзе будуць прадстаўлены розныя катэгорыі тавараў: ад кандытарскіх вырабаў і касметыкі да сельскагаспадарчай тэхнікі. Акрамя таго, адбудзецца сумесны бізнес-форум, удзел у якім прымуць кіраўнікі двух гарадоў Андрэй Шорац і Каха Каладзэ. Падчас дзелавой сустрэчы мэры плануюць абмеркаваць і падпісаць праграму гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва на 2018—2020 гады.

Урачыстае адкрыццё Дзён Мінска і святочны гала-канцэрт адбудзецца ў Тбіліскім дзяржаўным акадэмічным тэатры імя Шато Руставелі. У ім возьмуць удзел Прэзідэнцкі аркестр Рэспублікі Беларусь і вядомыя беларускія артысты эстрады, оперы і цырка. У тэатры таксама будзе прадстаўлена ўнікальная фотавыстава «Партрэт горада Мінска», якая пакажа развіццё горада на працягу апошніх стагоддзяў. Да гэтага збор яшчэ ні разу не выстаўляўся разам. Не абыдзецца і без спартыўных спаборніцтваў. Адбудзецца таварыскі матч па футболе, а таксама шахматны турнір сярод юных гросмайстраў.

Акрамя прэзентацыі патэнцыялу Рэспублікі Беларусь у розных сферах, нашы дэлегаты азнаёмяцца з напрацоўкамі грузінскіх калег. Напрыклад, у Грузіі дзейнічае адзіная служба аказання экстраннай дапамогі «112», якая аб'ядноўвае ў адно паліцэйскіх, ратавальнікаў і медыкаў. Таксама цікавы досвед працы сістэмы «Адно акно». Усе дзяржаўныя паслугі ў Тбілісі сканцэнтраваны ў адным месцы — Доме Юстыцыі. Ён арганізаваны па самых сучасных методыках: напрыклад, работнікі розных дэпартаментаў апранутыя ў пэўныя колеры, пашпарты выдае спецыяльны прыбор, а забраць патрэбныя дакументы можна не выходзячы з машыны — іх могуць перадаць праз спецыяльнае акно. Важным этапам сустрэчы стане наведванне агенцтва па інавацыях і тэхналогіях Грузіі, якое збіраецца заключыць пагадненне аб супрацоўніцтве з Мінскім гарадскім тэхнапаркам.

Супрацоўніцтва з Грузіяй засяроджана не толькі на ўзаемаадносінах двух гарадоў Мінска і Тбілісі, зараз, напрыклад, прапрацоўваецца пытанне паставак электробусаў «Белкамунмаш» для Батумі. Гаворка ідзе пра доследную эксплуатацыю, паколькі трэба праверыць, як тэхніка зможа прыстасавацца да гарыстага рэльефу горада.

У цяперашні час Мінскам заключаны пагадненні аб пабрацімскіх адносінах з 27 гарадамі свету. Ужо ў красавіку ў межах Дзён Мінска ў венгерскай сталіцы ў гэты спіс павінен трапіць Будапешт. У горадзе непадалёк ад пасольства нават з'явіцца своеасаблівы куток Мінска. Сярод маштабных мерапрыемстваў, запланаваных на найбліжэйшы час, таксама Дні Мінска ў Санкт-Пецярбургу. Яны пройдуць у першым паўгоддзі 2018 года.

**Дар'я КАСКО**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## КАЛІ ЗДАРОЎЕ — ПРЫЯРЫТЭТ

На працягу тыдня сталічныя медыкі кансультуюць жыхароў усіх раёнаў сталіцы

**Тэрапеўты, кардыёлагі, стаматолагі, псіхіятры і іншыя спецыялісты на пляцоўках, якія размешчаны ў буйных гіпермаркетах і ўнівермагах, даюць неабходныя кансультацыі ўсім ахвотным.**

А вось на адно з самых буйных прамысловых прадпрыемстваў Мінска — ААТ «МАЗ» — медыкі прыехалі самі. Работнікі завода змаглі змерыць артэрыяльны ціск, ацаніць наяўнасць фактараў рызыкі інфаркту і інсульту і іншых хвароб сэрца, атрымаць адказы на свае пытанні і кансультацыі па здаровым ладзе жыцця.

— Мы выбралі самыя шматлюдныя гандлёвыя пункты нашага раёна, найбуйнейшае прадпрыемства, і акцыя выклікала цікавасць. У прыватнасці, за тры гадзіны на пляцоўцы ўнівермага «Беларусь» да спецыялістаў звярнулася каля 150 чалавек, — расказала **намеснік галоўнага ўрача па арганізацыйна-метадычнай рабоце 21-й цэнтральнай раённай паліклінікі Заводскага раёна Мінска Іна ПУСТАВІТ.**

Дарэчы, у межах святкавання 80-годдзя Заводскага раёна, медыкі арганізавалі акцыю «Здароўе завадчан — прыярытэт». Сёння яна пройдзе ў гандлёвым цэнтры «Мома» (Партызанскі праспект, 150а) і гіпермаркеце «Прастор» (Партызанскі праспект, 182) з 12 да 15 гадзін. А заўтра ў той жа час да медыкаў можна будзе звярнуцца на спецыяльнай пляцоўцы ў гіпермаркеце «Прастор» (вул. Убарэвіча, 176).

**Алена КРАВЕЦ.**

## ТРАКТАРЫ ВЫХОДЗЯЦЬ У ПОЛЕ

**Асобныя гаспадаркі Брэстчыны пачалі палявыя работы. У асноўным вядзецца вываз арганікі, падкормка раслін, падсяваюцца травы.**

— У цёплыя дні падкармілі ўгнаеннямі пасевы гаспадаркі «Астрамечава», «Чарнаўчыцы», некаторыя іншыя, — сказаў карэспандэнту газеты **намеснік старшыні Брэсцкага райвыканкама Віктар ЛУКАШЭВІЧ.** — Зараз работу спынілі, бо снег растаў поўнасцю, на палях многа вільгаці, з тэхнікай не ўлезеш.

А вось на Кобрыншчыне — гэта не самы паўднёвы раён вобласці — некаторыя сельгаспрадпрыемствы вядуць падсеў травы. Паводле меркавання **кіраўніка райсельгасхарча Сяргея БАРТАША,** магчымыя замаразкі не паўплываюць на пасевы, тым больш што маразы ў нас адзінкава невялікія.

Згодны з калегам і **кіраўнік аграрнай галіны Драгічынскага раёна Сяргей ГЛІНСКІ.** Ён сказаў, што сеяць, напрыклад, канюшыну зараз самы аптымальны перыяд. Насенне гэтай культуры глеба літаральна ўсмоктвае, а ўзыдзе пасеў тады, калі сонейка прагрэе зямлю. Толькі адна гаспадарка Драгічыншчыны — «Райаграсэрвіс» ужо пасеяла больш за 200 гектараў канюшыны.

Усяго ў рэгіёне гэтай вясной трэба будзе пасеяць яравыя культуры на плошчы 420 тысяч гектараў, паведамілі ў камітэце па сельскай гаспадарцы і харчаванні аблвыканкама.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## ПЛЮС АДНА КАПЕЙКА НА АЗС

**У краіне з 15 сакавіка змяняюцца розничныя цэны на аўтамабільнае паліва.**

Па інфармацыі канцэрна «Белнафтахім», розничныя цэны на аўтамабільны бензін і дызельнае паліва на аўтазаправачных станцыях павялічваюцца на адну капейку, або ў сярэднім на 0,76 %.

Кошт аднаго літра бензіну АІ-92-К5-Еўра складзе 1,23 рубля, АІ-95-К5-Еўра — 1,31, АІ-98-К5-Еўра — 1,53, ДТ — 1,34 рубля.

У канцэрне нагадалі, што ў Беларусі распрацаваны новы механізм змянення цэн на аўтамабільнае паліва. Ім у залежнасці ад змены сітуацыі на нафтавым рынку прадугледжваецца магчымасць карэкціроўкі цэн на нафтапрадукты як у бок павелічэння, так і зніжэння. Пры гэтым прадугледжваецца паступовы выхад на ўзровень цэн, супастаўны з дзеючым на расійскім рынку. У далейшым цэны будуць карэктавацца ў адпаведнасці са зменамі сусветных цэн на нафту, курса нацыянальнай валюты і падатковай нагрузкі на нафтаперапрацоўчыя заводы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# Крокі да дабрабыту

## Дзе ў Воранаўскім раёне з'явяцца кашэрны рэстаран і цэнтр нацыянальных культур

**Пра планы раёна расказвае яго кіраўнік, старшыня Воранаўскага райвыканкама Мікалай РОЗУМ.**



***— Мікалай Аркадзевіч, які вытворчы патэнцыял у раёне будзе задзейнічаны ў гэтым годзе, што новага прапануюць вашы прадпрыемствы на айчынны рынак і на экспарт?***

— Сёлета, як і ў мінулым годзе, мы скіраваны на тое, каб не зніжаць тэмпы вытворчасці. Гэтыя паказчыкі ў значнай ступені забяспечвае адно з найбуйнейшых прадпрыемстваў раёна — ААТ «Воранаўская сельгастэхніка», дзе наладжаны выпуск прычэпаў для рознага віду палявых работ. Сёлета тут плануюць працягваць сертыфікацыйныя выпрабаванні і атрыманне сертыфікатаў на доследныя партыі новых агрэгатаў. Напрыклад, зараз праходзіць выпрабаванне транспартна-тэхналагічная сістэма грузападымальнасцю 40 тон. Што датычыцца знешніх рынкаў, працягваецца работа па наладжванні сумеснай вытворчасці прычэпаў з пастаўкамі машынных камплексаў у Расійскую Федэрацыю. Таксама асвойваюцца і іншыя напрамкі збыту ў рэгіёны краін СНД. У планах — экспартаваць сваю прадукцыю ў Казахстан, Узбекістан, Літву. Прагназуецца, што аб'ём экспарту прадпрыемства складзе каля аднаго мільёна долараў.

Мяркуем, што не здадуць сваіх пазіцый прыватныя прадпрыемствы. Сярод іх — фірма па выпуску адзення «Веранова», якая мае дагаворы на пастаўкі жаночай бялізны ў Расію, Літву, Эстонію, Малдову. Сялянская гаспадарка вырошчвае і рэалізуе сеянцы лясных дрэў, якія маюць попыт за межамі краіны. У экспартным патэнцыяле — медыцынскія і транспартныя паслугі.

***— Якія важныя крокі, на ваш погляд, трэба зрабіць, каб палепшыць дабрабыт жыхароў раёна?***

— Лічу, што галоўны паказчык дабрабыту — праца і дастойная заработная плата. Мы таксама, наколькі магчыма, стараемся гэты паказчык палепшыць. Сёлетні рост зарплаты, у параўнанні з леташнім, плануецца на ўзроўні 122 %.

Што датычыцца сітуацыі на рынку працы, то ўзровень беспрацоўя ў нас адносна невысокі. Летась працаўладкавана 673 чалавекі, з іх 422 — беспрацоўныя. Разам з тым рынак працы раёна нельга назваць спрыяльным. Зніжаецца колькасць насельніцтва ў працаздольным узросце, а таксама занятых у эканоміцы. Па прагнозах, сёлета будзе зарэгістравана да 700 беспрацоўных. Рынак працы папоўняць тыя, хто раней быў заняты хатняй гаспадаркай, не мае кваліфікацыі і доўга не працаваў.

У той жа час попыт на працоўную сілу не зніжаецца. Размеркаванню свабоднай рабочай сілы садзейнічае стварэнне новых працоўных месцаў. Іх у мінулым годзе створана больш за 50. Сёлета плануем прыцягнуць у эканоміку на вакансіі і новыя працоўныя месцы не менш за 510 чалавек, у тым ліку 360 беспрацоўных.

***— На што будзе звернута ўвага ў плане аднаўлення аб'ектаў, будаўніцтва новых, прыцягнення інвестыцый у раён?***

— Плануем правесці рэканструкцыю шэрагу аб'ектаў сацыяльнай сферы. У іх ліку — другі пускавы комплекс Воранаўскай сярэдняй школы, тут работы вядуцца за кошт сродкаў, якія выдзяляе Сусветны банк. Будзем ажыццяўляць мадэрнізацыю даху і бытавых памяшканняў у Радунскай школе-інтэрнаце. Распачнём рэканструкцыю будынка пачатковай школы ў Радуні пад цэнтр нацыянальных культур.

Будзем працягваць і будаўніцтва жылля. Сёлета плануем здаць амаль восем тысяч квадратных метраў з улікам індывідуальнага будаўніцтва.

У нас сфарміраваны папярэдні пералік неэфектыўных аб'ектаў. Мяркуем увесці ў гаспадарчы абарот тры з іх.

Асноўныя інвестыцыі забяспечваюць мясцовыя прадпрыемствы і арганізацыі. Разам з гэтым плануем прыцягнуць і замежны капітал. Вядуцца перамовы з прадстаўнікамі расійскага бізнесу аб стварэнні на тэрыторыі раёна замежнага прадпрыемства для рэалізацыі інвестыцыйнага праекта. На плошчы ў пяць гектараў непадалёк ад аўтадарожнага пункта пропуску «Беняконі» з'явіцца лагістычны цэнтр з укараненнем сістэмы «электронная чарга».

Сёлета пачнецца рэалізацыя інвестыцыйнага праекта, які некалькі гадоў на слыху. Кампанія «Ор Меір» будзе весці будаўніцтва гасцінічнага комплексу ў гарадскім пасёлку Радунь. Сярод аб'ектаў — гасцявыя малапавярховыя домікі, адміністрацыйныя будынкі, рэстаран кашэрнага харчавання, лазні міквы, сінагога, сувенірныя крамы, паркоўкі. Плошча будучага комплексу складае амаль тры гектары.

**Маргарыта УШКЕВІЧ**

■ Тры пытанні да ўлады

■ Сталічны час

# У Мінску да лета абновяць масты і дарогі

**Ямкі на сталічных вуліцах знікнуць да пачатку мая. Пра гэта заявіў генеральны дырэктар прадпрыемства «Гаррамаўтадар Мінгарвыканкама» Дзяніс ГЛІНСКІ. Таксама ў планах дарожнікаў абнавіць масты і заняцца падрыхтоўкай горада да II Еўрапейскіх гульняў, якія пройдуць у наступным годзе.**

## Пачнуць работу, калі пацяплее

Па словах Дзяніса Глінскага, ямачнасць на мінскім дарожным палатне ўтварылася з-за вагання тэмператур. А ліквідаваць яе зараз перашкаджае зіма.

«Калі тэмпература будзе вышэйшая за пяць градусаў, мы зможам працаваць з гарачымі асфальтабетоннымі сумесямі і ліквідаваць ямкі», — расказаў Дзяніс Глінскі.

Ён таксама адзначыў, што сёлета ўжо адрамантавана больш за сем тысяч «квадратаў» дарог. У сваю чаргу **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення аўтамабільных дарог Міністэрства транспарту і камунікацый Сяргей ЛЯВОНЧЫК** расказаў, што асноўныя работы плануюцца ў сакавіку і красавіку.

«Асноўны ўпор у красавіку робіцца на дарогі ў 50-кіламетровай зоне ад Мінска, вялікая ўвага ўдзяляецца дарозе М2», — растлумачыў Сяргей Лявончык.

Зараз ідуць падрыхтоўчыя работы, чысціцца праезная частка, ліквідуецца дробная ямачнасць. У першую чаргу гаворка ідзе аб ачыстцы дарог ад процігалалёдных матэрыялаў, прывядзенне ў нармальны стан паласы адводу аўтадарог, праверка стану дарожных знакаў, пляцовак для адпачынку, прыпыначных пунктаў.

## Дарогі каля стадыёна «Дынама» зменяцца

Да II Еўрапейскіх гульняў, якія пройдуць у Мінску ў 2019 годзе, будуць абноўлены дарожнае пакрыццё і тратуары на прылеглай да стадыёна «Дынама» тэрыторыі.

«Але гэта не значыць, што мы забудзем пра іншыя вуліцы. Цяпер рыхтуецца праграма, на сесіі Мінгарсавета ў канцы сакавіка яна будзе разгледжана, выдзелена фінансаванне на рамонт з поўнай заменай асфальтабетоннага пакрыцця на шматлікіх мінскіх вуліцах», — адзначыў Дзяніс Глінскі.

Паводле яго слоў, спецыялісты «Гаррамаўтадара» будуць працаваць не толькі ў цэнтры, але і ў спальных раёнах. Акрамя таго, «Гаррамаўтадар Мінгарвыканкама» сёлета заменіць асфальтабетоннае пакрыццё на ўчастку Мінскай кальцавой аўтадарогі ад вуліцы Прытыцкага да Жданові́ч.

## Капітальна зоймуцца мастамі

Па словах Дзяніса Глінскага, сёлета будзе зроблены капітальны рамонт з мадэрнізацыяй моста цераз Свіслач па вуліцы Машэрава. У ходзе капрамонту плануецца ўмацаваць канструкцыі, замяніць асфальтабетоннае пакрыццё, пашырыць тратуары для пешаходаў. Гендырэктар «Гаррамаўтадара Мінгарвыканкама» таксама паведаміў, што падчас рамонтных работ закрываць мост для руху не плануецца. Абмежаванні праездаў пры гэтым магчымыя. Таксама сёлета рамонт будзе праводзіцца на 12—14 мастах і пуцеправодах.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

# КРАЙ ШТУЧНЫХ ГОР

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Але снегавы палігон — гэта не проста тэрыторыя, дзе, здавалася б, у хаатычным парадку ляжаць кучы снегу. Тут ёсць вагончык, у якім праца вартаўнік.

— Не, я тут не снег ахоўваю, — усміхаецца **Уладзімір ПОРАХ.** — Я сачу за парадкам. Не так даўно дзеці хацелі зрэзаць дарогу праз наш палігон. Я іх спыніў, растлумачыў, што тут пабочным асобам хадзіць нельга. Яшчэ я рэгіструю кожнага вадзіцеля.

У спецыяльным журнале каліграфічным почыркам выведзены даты, пад імі — час, арганізацыя, нумар аўтамабіля, аб'ём, прозвішчы кіроўцаў. На гэты палігон прывозяць снег 18 прадпрыемстваў, размешчаных у Фрунзенскім раёне. Яны прыбіраюць снег сваімі сіламі і заключылі з Рамаўтадарам адмысловы дагавор на вываз. У спецыяльны талон упісваецца кубатура. Напрыклад, 30-тонны самазвал прывозіць сюды 21 кубічны метр снегу. І ў гэты час каля будкі вартаўніка на выезд пайшоў гіганцкі жоўты грузавік.

— Гэта паехаў дваццацітоннік! — кажа **начальнік участка па ўтрыманні вулічна-дарожнай сеткі УП «Рамаўтадар Фрунзенскага раёна Мінска» Арцём ШЫНКЕВІЧ.** — Ён прывёз сюды чатырнаццаць кубаметраў снегу. А вось зараз на разгрузку прыехала машына грузападымальнасцю ў 10 тон. Вось бачыце, літаральна хвіліна-другая — аўтамабіль разгрузіўся і гатовы ў зваротны рэйс. А ўсяго такіх рэйсаў за змену можа быць ад 10 да 12. Скажам, на прыпынак, дзе ссунулі снег у кучу, прыехаў пагрузчык і аўтамабіль. Два-тры каўшы — і дзесяцітонны самазвал запоўнены цалкам. Мы ж на дзяжурным аўтамабілі маніторым якасць таго, як чысцяцца вуліцы. І пры неабходнасці пераразмяркоўваем тэхніку.

Толькі за люты на снегавы палігон даставілі 8700 кубаметраў снегу, сабраных на дарогах Фрунзенскага раёна. За выключэннем дзвюх вуліц — магістральныя Кальварыйскую і Прытыцкага чысціць аўтамабілі цэнтральнага падраздзялення. Да таго ж работы падбавіў сакавік. Як кажа Арцём Шынкевіч, снег тут будзе раставаць да канца мая, а можа, нават і да сярэдзіны чэрвеня. Усё залежыць ад таго, якой будзе вясна — сонечнай і цёплай або халоднай і пахмурнай. Але паскорыць гэты працэс можна. Спецыяльны бульдозер разраўноўвае і буртуе гурбы, каб яны зніклі як мага хутчэй і не замінаюць кіроўцам прывозіць новыя партыі снегу.

— Мы здавалі ранейшы палігон на вуліцы Шаранговіча ў маі-чэрвені мінулага года, — працягвае Арцём Шынкевіч. — Калі паглядзіце на карту горада, то там велізарная пустка. І сабралі там даволі шмат пустых пластыкавых бутэлек. Гэта і не дзіўна — калі на праезнай частцы ляжыць нейкае смецце, то яно заграбаецца каўшом пагрузчыка. Напрыклад, прыйшоў кіроўца, даліў тасол, а бутэльку кінуў у снег. Ці папіў кавы, а аднаразовы кубачак — таксама ў гурбу. Аднойчы ў снезе знайшлі нават мабільны тэлефон....

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# МУЗЕЙ, АЛЕЯ КІНО І ПЛЯЦОЎКІ АГЛЯДУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Упершыню ў Гродне з'явяцца адразу дзве аглядныя пляцоўкі. Адна з іх размесціцца на даху гандлёвага дома ў цэнтры Гродна, другая — на беразе Нёмана. З яе можна будзе ўбачыць цудоўныя віды Старога горада, у тым ліку замкі і Каложскую царкву. Абедзве пляцоўкі будуць абсталяваны біноклямі, альтанкамі і архітэктурнымі кампазіцыямі.

Каля Новага замка падрыхтавана пляцоўка для ўстаноўкі помніка Давыду Гарадзенскаму — гродзенскаму старасту і палкаводцу XIV стагоддзя. Паколькі партрэтаў князя не захавалася, аўтар праекта падаў яго рысы без дэталізацыі, але постаць — на кані з мячом і шчытом. Таксама на помніку будуць бачны вывы Старога замка і Каложы. Адкрыццё адбудзецца падчас фестывалю.

Яшчэ адзін цікавы праект знойдзе ўвасабленне на вуліцах Гродна. Гэта — «Алея кіно», дзе будуць увекавечаны 10 мастацкіх фільмаў, здымкі якіх праходзілі ў горадзе. Сярод іх — «Мяне завуць Арлекіна», «Я родам з дзяцінства», «Міколка-паравоз», «Белыя Росы», «Смерш», «Рудабельская рэспубліка» і іншыя. Знакавыя для кожнага фільма моманты будуць адлюстраваны ў скульптурных кампазіцыях, пано, інфармацыйных пюпітрах. «Алея кіно» раскінецца па ўсім горадзе.

Гродзенскія мастакі ўпрыгожаць арнаментамі тарцовыя сцены будынкаў у цэнтры горада. Мяркуецца зрабіць вялікае пано на схіле каля Нёмана.

Будзе праведзены рамонт 120 жылых дамоў і каля 40 адміністрацыйных будынкаў.

Чакаецца ўдзел у фестывалі прадстаўнікоў 35 нацыянальнасцяў. Упершыню прымуць удзел балгары, арабы, тамілы і некаторыя іншыя народы, якія сёння пражываюць у Беларусі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Сямейная газета

Выпуск № 5 (96)



## ВЕРЫНЫ КАЗКІ

Скінуць вагу. Вывучыць англійскую. Напісаць кнігу. Бегаць кожную раніцу. Навучыцца іграць на гітары. Асвоіць сляпы метад набору тэксту. Адкрыць бізнес...

Кожны раз, калі Іван Пірог, які вядзе блог пра псіхалогію, ставіў перад сабой новую мэту, то дзяліўся гэтай навіной з сябрамі, бацькамі і калегамі па працы. Казаў ім, што збіраецца зрабіць тое ці іншае. Або паведамляў, што ўжо пачаў гэта рабіць.

«Дарэчы, я збіраюся напісаць раман», «Мы з сябрамі ствараем камп'ютарную гульню», «У найбліжэйшы час збіраюся заняцца сваім бізнесам». Калі я аб'яўляў пра свае намеры, то ў 95 % выпадкаў не даводзіў пачатае да канца. Мэта пераставала быць жаданай або шлях да яе аказваўся доўгім і не прыносіў радасці. Пры гэтым я заўважыў, што часцей за ўсё дасягаў мэт, пра якія нікому не расказваў». У пацвярджэнне свайго назірання Іван прывёў эксперыменты нямецкага прафесара псіхалогіі Пітэра Гольвітцэра, які вывучае дадзены феномен ужо больш за 15 гадоў. Ён даказаў, што мэты, пра якія ты кажаш іншым, не здзяйсняюцца.

Я згодна з блогерам і з нямецкім прафесарам. Але толькі часткова. Часам мары спраўджваюцца толькі таму, што іншыя людзі даведваюцца пра іх.

Веры Сібіравай 88 гадоў. Яна жыве на радзіме Мулявіна, у Екацярынбургу. Піша добрыя казкі. І марыць выдаць вялікую кнігу з каляровымі ілюстрацыямі сваёй дачкі, якая памерла ад раку. Нават назву прыдумала — «Бяздоннае возера».

Пенсія ў Веры Васілеўны невялікая. Таму, каб ажыццявіць сваю мару, яна амаль кожны дзень (і нават у моцныя маразы!) стаіць па некалькі гадзін каля крам, спрабуючы прадаць свой першы зборнік казак. За гэтым заняткам яе і прыкмецілі журналісты. Зрабілі невялічкі сюжэт на тэлебачанні.

Так я даведалася, што ў сярэдзіне 90-х Вера Сібірава выпусціла свой першы зборнік накладам у дзве тысячы асобнікаў. З чорна-белымі малюнкамі сваёй дачкі. Святлана працавала інжынерам, але захаплялася маляваннем і з задавальненнем рабіла ілюстрацыі да матчыных казак. Першая Верына кніжка выдадзеная на звычайнай газетнай паперы, бо друкавала яе бабуля за кошт сваёй пенсіі. Хацела прадаць, але не атрымалася: пайшоў з жыцця муж, і жанчына надоўга закінула задуму. Год таму ў Веры Васілеўны памерла яшчэ і дачка. Цяпер бабуля адна клапоціцца пра ўнучку.

Пасля сюжэтаў і публікацый у сацсетках і СМІ пра Веру даведаўся ўвесь свет, на журналістаў абрынуўся шквал званкоў ад тых, хто хоча дапамагчы. Калі Вера Васілеўна чарговы раз прыйшла прадаваць свае кнігі, на месцы яе ўжо чакала велізарная чарга ахвотных іх купіць. А нядаўна адна з пакупніц падарыла бабулі пішучую машынку, каб яна больш не пісала свае казкі ад рукі. І што самае галоўнае: многія выдавецтвы прапанавалі казачніцы супрацоўніцтва. Яна выбрала друкарню, якая знаходзіцца ў родным горадзе. Зараз вялікая кніга бабуліных казак з каляровымі ілюстрацыямі яе дачкі ўжо ў рабоце! Дарэчы, першую кніжку Веры Сібіравай, з якой усё пачалося, цяпер можна набыць анлайн як у друкаваным, так і ў электронным выглядзе з любога месца свету (https://ridero.ru/books/skazki_i_skazy/).

Цікавае супадзенне. У той момант, калі я ўжо збіралася здаваць гэтую калонку, мне напісала аднакурсніца. Маўляў, ёй у рукі трапілі вельмі цікавыя апавяданні, якія піша бабуля на беларускай мове. «Мне іх даслала яе ўнучка. Можа быць, яны зацікавяць «Сямейную газету»?» Пачытаць тыя апавяданні я яшчэ не паспела. Жыву ў прадчуванні...

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

■ Жывыя традыцыі

# ЗАКІНУЛІ ЗАЙЦА

### У ВЁСЦЫ СУДЗІЛЫ ЗЛАДЗІЛІ РЭКАНСТРУКЦЫЮ ВЯСЕЛЬНАГА АБРАДУ



Фота Надзеі САБІРАВАЙ.

**У ролю жаніха цудоўна ўжыўся сын мясцовых жыхароў, малодшы навуковы супрацоўнік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксандр Галкоўскі.**

**Нявеста таксама прыехала з Мінска. Марына Бондарава працуе архітэктарам.**

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

■ Сустрэча без абцасаў

Кацярына РУСАНАВА:

# «МАРУ, КАБ БЫЛО ЯК МАГА МЕНШ «ПАРАНЕНЫХ МАМ»

**«Аборты — мой боль». Гэта першая фраза, якую я пачула ад псіхолага барысаўскага раддома, калі дамаўлялася з ёй на інтэрв'ю**

**Размаўлялі мы з Кацярынай Дзмітрыеўнай у пакойчыку, дзе яна штодзень вось ужо 15 гадоў кансультуе цяжарных. Адразу ж у вочы кінуліся мяккія цацкі на крэслах ды папяровая аплікацыя на сцяне — жанчына, якая беражліва выпускае са сваёй далоні рознакаляровых матылькоў. Сюжэт псіхолаг прыдумала сама. «Жанчына па сваёй прыродзе можа нарадзіць да дзесяці дзяцей. Таму тут дзесяць праменьчыкаў. Каб наша краіна квітнела, кожная беларуска павінна нарадзіць пяцярых дзетак. Каб не вымерла — хаця б па трое». І Кацярына Дзмітрыеўна расказала прытчу пра матылька. «У адным горадзе жыў мудрэц. Але знайшоўся зайздроснік, які пачаў думаць, як даказаць іншым людзям, што на самай справе больш мудры ён. Вырашыў: «Я вазьму матылька, схаваю яго паміж далоняў, падыду на вачах ва ўсіх да мудраца і спытаюся ў яго: «Скажы, што ў мяне ў руках?» Ён, вядома ж, здагадаецца, што матылёк. Тады я яго спытаю: «А які гэта матылёк, жывы ці мёртвы?» Калі скажа, што матылёк жывы, тады я зусім непрыкметна сцісну свае далоні і раздушу яго. А калі скажа, што мёртвы, тады я адпушчу яго. І ўсе ўбачаць, што мудрэц памыліўся». Так ён і зрабіў. Узяў матылька, падышоў да мудраца і спытаўся ў яго: «Скажы, які матылёк у маіх далонях: жывы ці мёртвы?» — «Усё ў тваіх руках», — адказаў мудрэц. Тое ж самае можна сказаць і адносна жанчын, якія прыходзяць да мяне на перадабортную кансультацыю. Усё ў іх руках».**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

# «МАРУ, КАБ БЫЛО ЯК МАГА МЕНШ «ПАРАНЕНЫХ МАМ»



У кабінеце Кацярыны Дзмітрыеўны ў дзень нашай гутаркі адбылося ажно чатыры выпіскі. Згадзілася на фотаздымку толькі Кацярына з Крупскага раёна. Маўляў, чаму б не расказаць усяму свету пра сваё шчасце. Маладой маці толькі 21 год — і ўжо трое дзяцей! Два сыночкі і дачушка Соня. Імя нованароджанай прыдумваў тата. Першае дзіця Каця нарадзіла ў 15 гадоў. Прызналася, былі думкі пра аборт. Але, на шчасце, мама падтрымала, сказала, што будзе дапамагаць выхоўваць унука. «Добра, калі ёсць падтрымка. Калі няма, то можна і глупства зрабіць. Сёння нікольні не шкадую, што нарадзіла так рана. Лепш нарадзіць, чым пасля мучыцца без дзяцей».

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

### ПРА СТРАХ НАРАДЖАЦЬ, МУДРАГА МУЖА ДЫ ВАЙНУ СА СВЕКРЫВЕЙ

**Калі маёй дачцэ быў годзік**, я стала дрэнна сябе адчуваць. Тады ніякіх тэстаў не было, пайшла да доктара. Ён сказаў: «Вы цяжарная». І назваў слова «аборт». Я такога слова не ведала нават. Прыходжу дадому і кажу мужу: «Сказалі зрабіць нейкі аборт. Маўляў, арганізм павінен адпачнуць пасля першых родаў». Ён быў, дзякуй богу, больш дасведчаны, таму не раздумваючы выпаліў: «Нават і не думай, там жа сын». Вы ведаеце, там сапраўды быў сын. Яму сёлета споўніцца 36 гадоў. Ён падарыў нам з мужам двух цудоўных унукаў. Я не магу казаць пра гэта без слёз. Страшна ўявіць, што яго магло б не быць, калі б паслухала доктара і зрабіла аборт. Хоць мне, калі шчыра, на той момант страшна было нараджаць другое дзіця. Дачушка ж маленькая на руках, а я адна, з тэмпературай, муж на палігоне як малады лейтэнант. Таму тэма абортаў — гэта мой боль. І мне вельмі шкада жанчын, якія ў сілу нейкіх абставін, маладосці, уплыву соцыуму не заўсёды своечасова спыняюцца.

**«Заходнія псіхолагі даказалі, што вялікая колькасць разводаў адбываецца па прычыне абортаў. Калі б людзі не рабілі гэтай самай страшнай аперацыі ў свеце, думаю, і сем'і былі б больш трывалымі».**

**Часта бывае так**, што пасля перарывання цяжарнасці, асабліва першай, жанчына становіцца бяздзетнай — гэта вялізная трагедыя.

**Даказана, што кожная жанчына, якая ідзе на аборт**, на падсвядомым узроўні чакае, каб яе хтосьці спыніў. Часта спадзяюцца, што ад памылковага кроку стрымае муж, але гэтага, на жаль, не адбываецца. Хоць адказнасць за зараджэнне новага жыцця павінна несці не толькі жанчына, але і мужчына.

**Усе думаюць, што на аборт прыходзяць у асноўным адзінокія маладыя дзяўчаты.** Але гэта далёка не так. Кожная жанчына, якая хоча перапыніць цяжарнасць, ананімна запаўняе анкету. І што вы думаеце, большасць з іх не першы год замужам, маюць сваё жыллё.

**Ёсць сем'і, дзе мужчыны настойваюць на абортце.** Вельмі шмат сітуацый, калі на гэта іх падбухторваюць уласныя маці. Прывяду толькі адзін прыклад. Аднойчы да мяне на перадабортную кансультацыю ў слязах прыйшла маладая дзяўчына, цяжарная трэцім дзіцем. Маўляў, муж сказаў: выбірай — альбо дзіця, альбо я. Як высветлілася, там рэй вядзе свякроў. Яна ўсяляк настройвала свайго адзінага сына, маўляў, ты трэцяе дзіця не пацягнеш, не выкарміш. У выніку жанчына насуперак усім нарадзіла трэцяга сына. Сёння яму тры годзікі. І што вы думаеце, надаўна пры сустрэчы шчаслівая маці трох хлопчыкаў падзялілася: менавіта малодшага сына больш за ўсё любяць і муж, і свякроў. А была ж такая вайна з іх боку, вам проста не перадаць.

**Псіхалагічная даабортная кансультацыя ў нашай краіне з'яўляецца абавязковай для ўсіх жанчын з 2014 года.** У гэтым плане барысаўскі радзільны дом асаблівы. Тут служба псіхалагічнай дапамогі існуе ажно з 2003 года.

**У нашым раддоме праходзяць трохэтапнае кансультаванне.** Спачатку жанчына трапляе на прыём да доктара. Ён ёй расказвае пра шкоду для цела. Затым ідзе да мяне, размаўляем пра душу. Потым прыходзіць святар — расказвае ёй пра дух. Пасля гэтага цяжарнай даецца тры дні цішыні, каб яна абдумала ўсё і прыняла канчатковае рашэнне. Ніводная жанчына ў маёй практыцы, якая захавала дзіця, не сказала: «Як дрэнна, што я гэта зрабіла». Усе толькі радуюцца.

### ПРА СІНДРОМ, ПАКУТЫ ДЫ ПОЗНІХ ДЗЯЦЕЙ

**Ёсць і тыя, хто ўсё ж такі кладзецца на аперацыйны стол...** Потым прыходзіць усведамленне здзейсненага ўчынку і надыходзіць постабортны сіндром, які нярэдка завяршаецца псіхічнымі расстройствамі. Свядомасць — верхняя частка айсберга. Падсвядомасць — тая частка псіхікі, якая «пад вадой». Яна намі кіруе. Свядомасць забівае дзіця, а падсвядомасць — пачынае крычаць: «Навошта ты забіла маё дзіця?» Як праявіцца постабортны сіндром у канкрэтнай жанчыны, ніхто не скажа. Гэта можа быць раздражненне на мужа, злосць на старэйшых дзяцей («я з-за цябе гэта зрабіла»), могуць сніцца жахі і чуцца дзіцячыя крыкі.

**У маёй тэлефоннай кнізе ёсць нумар жанчыны**, якая займае ў горадзе добрую пасаду. У іх з мужам двое цудоўных дзетак-школьнікаў. І раптам у яе незапланаваная цяжарнасць. Яна хоча пакінуць дзіця, вагаецца. Муж кажа: «Не, мы не пацягнем, ідзі рабі аборт». І яна зрабіла. У яе постабортны сіндром выявіўся ў форме моцнага жадання мець маленькае дзіця. Але нарадзіць дагэтуль так і не змагла. Пайшлі выкідыш за выкідышам... Сёння на гэтую жанчыну балюча глядзець...

**У нас у горадзе ёсць валанцёрскі рух супраць абортаў.** Сярод актывістаў шмат сталых жанчын, якія некалі зрабілі аборт і якім гэта баліць. Яны пакутуюць і такім чынам стараюцца кампенсаваць сваю віну, дапамагчы іншым не паўтарыць іх памылку. Напярэдадні Раства гэтыя жанчыны перадаюць адзінокім мамачкам, якія знаходзяцца ў складаным матэрыяльным становішчы, новае адзенне для малечы, свечку і крыжык.

**Большасць жанчын, якія рашыліся на аборт пасля 40 гадоў**, робяць гэта зусім не таму, што ім дзіця не патрэбна. А з-за страху нараджаць у познім узросце, з-за навязаных грамадствам стэрэатыпаў. Маўляў, сорамна, што людзі скажуць, дзеці дарослыя, трэба рыхтавацца нянчыць унукаў. Больш смелыя жанчыны паслябальзакаўскага ўзросту — тыя, якія ствараюць сям'ю паўторна. Бо яны хочуць мець агульнае дзіця з новым мужам. Вось сёння выпісвалася мама, якой каля сарака. У яе другі шлюб. Брацікa прыйшла сустракаць і яе старэйшая дачка — студэнтка.

**Целам кіруе душа.** У маёй практыцы было вельмі шмат прыкладаў, калі быццам бы і дактары не раяць па медыцынскіх паказаннях нараджаць. А жанчына кажа: «Я хачу дзіця». Гэтае «я хачу» мае такую сілу, што пераадольвае ўсё. І медыцына спраўляецца. У выніку гэта вялікая радасць. Усе, як адна, «узроставыя» мамы кажуць, што позняе мацярынства асаблівае, больш свядомае.



Жанчынам, якія прыйшлі на перадабортную кансультацыю, Кацярына Русанава паказвае вось гэты эмбрыён. Лялька, зробленая ў натуральную велічыню, дае візуальнае ўяўленне пра тое, як выглядае дзіця на 12-м тыдні цяжарнасці (менавіта да гэтага тэрміну можна рабіць аборт). Такім нестандартным спосабам удалося захаваць не адно жыццё.

**А вы ведалі, што дзіця пляскае ў далонькі ад радасці, калі тата кажа маме, што ён яе кахае?** Перынатальная псіхалогія — гэта маё хобі. *(Кацярына Дзмітрыеўна мае сертыфікат перынатальнага псіхолага.)* Гэта навука, якая вывучае псіхічнае развіццё дзіцяці ва ўлонні мамы. Лічу, што кожны чалавек на зямлі павінен ведаць пра такую навуку. Бо гэта цуд. Як толькі дзве клеткі сустрэліся, яшчэ няма ні мозга, ні сэрца, але дзіця ўжо рэагуе на настрой мамы. Мама радуецца — маленькая кропачка, якую відаць толькі пад мікраскопам, качаецца павольна. Мама сумуе, перажывае, плача — дзіця стукае так, як стукае наша сэрца, калі ў нас трывога.

**Вельмі балюча**, што людзі да канца не ўсведамляюць, што дзіця — гэта плод кахання мужчыны і жанчыны. І калі гэты плод забіваецца, адносіны разбураюцца, страчваюцца ранейшыя пачуцці. Стандартная дзяжурная фраза: «Мы разышліся, бо не сышліся характарамі». Пытаюся: «Вы колькі гадоў пражылі?» — «10, 15 нават больш». — «Вы ў загс ішлі па каханні». — «Так». — «А што здарылася?» — «Не ведаю». — «Можа, у вас былі перарыванні цяжарнасці? — «Так, былі». Заходнія псіхолагі даказалі, што вялікая колькасць разводаў адбываецца па прычыне абортаў. Калі б людзі не рабілі гэтай самай страшнай аперацыі ў свеце, думаю, і сем'і былі б больш трывалымі.

### ПРА «ЭГА», БЕЗДАПАМОЖНАСЦЬ ДЫ НЕВЫТЛУМАЧАЛЬНУЮ РАДАСЦЬ

**Сёння кожны доктар мае права** па сваім рэлігійным перакананні адмовіцца ад правядзення аборту. Гэта прадугледжана законам «Аб ахове здароўя», які ўступіў у сілу 27 снежня 2014 года. Вы, напэўна, ведаеце, што Лагойск — горад без абортаў. З аднаго боку, я радуюся, што дактары праявілі сваю актыўную пазіцыю, мужнасць. З другога — калі жанчына задумала зрабіць аборт, яна яго зробіць і ў іншым месцы, нават нелегальна. Таму я супраць усеагульнай заканадаўчай забароны абортаў у нашай краіне.

**Калі спружыну сціснуць**, яна потым дасць вельмі вялікую рэакцыю. Усеагульнай забаронай мы нічога не дасягнём. Наадварот, можам паставіць пад пагрозу жаночае здароўе. Нават цяпер, калі дазволены аборт, цяжарныя, якія не ўкладваюцца ў тэрміны, ідуць на такія глупствы, што проста страшна робіцца. Мая пазіцыя і большасці маіх калег: хоць аборт — гэта грэх, але забарона не выйсце з сітуацыі. Я — за актыўную тлумачальную, прафілактычную работу.

**Хочаце, падзялюся яшчэ адной прытчай?** Я яе часта расказваю жанчынам, якія прыходзяць да мяне на кансультацыю. Да старца звярнулася вельмі бедная сямейная пара. «Я цяжарная пятым дзіцем, а ў нас ужо і так чацвёра. Калі пятае народзіцца — не пражывём. Яго нават няма куды спаць пакласці. Дабраславіце на аборт». На што старац адказаў: «Калі ўжо так не пад сілу, што ж, дабраслаўляю вас забіць сваё дзіця. Толькі забівайце старэйшую дачку. Ёй ужо пятнаццаць, пажыла крыху на свеце, пабачыла маму, сонца. Маленькага нельга чапаць. Ён самы бездапаможны. Нават схавацца нікуды не можа». Жанчына закрыла твар рукамі, зарыдала і... нарадзіла пятае дзіця.

**Нядаўна ў літаратуры сустрэла такое паняцце: сучасная жанчына — гэта «параненая мама».** Бо па прыродзе ў нас закладзена любоўі на 10 дзяцей. Калі нараджаем аднаго-двух, то мы ў іх гэту любоў укладваем. Адсюль так шмат праблем паміж бацькамі і дзецьмі. Бо мы залюбліваем сваіх крывіначак, а яны ў адказ аддаляюцца. Не сакрэт, што моцная любоў — горшая за нянавісць. Якая мама не параненая? Даказана, што сапраўдны мацярынскі інстынкт прачынаецца пры нараджэнні пятага дзіцяці. І сапраўды, усе жанчыны, якія нарадзілі пятае немаўля ў нашых сценах, прызнаюцца, што адчуваюць нейкую невытлумачальную, дагэтуль няведамую, радасць унутры.

**У сучасным грамадстве, на жаль, дзяцей нараджаюць дзеля задавальнення свайго «эга».** Я ў свой час сябе задаволіла. У мяне ёсць і дзяўчынка, і хлопчык. Часта сама ў сябе пытаюся: адкуль у цябе гэта ўсё ўзялося? Я змалку вельмі люблю дзяцей. Калі мне было 7-8 гадоў, пакуль іншыя дзеці гулялі на дварэ, я з задавальненнем нянчыла сваіх пляменнікаў. У мяне моцны мацярынскі інстынкт. Але соцыум адыграў сваю ролю. Успамінаю, калі я выходзіла замуж, ён даваў установку: пажыві спачатку для сябе. Мне горка і балюча ад гэтага.

**Вельмі хацелася б, каб усе жанчыны адчулі шчасце мацярынства.** І каб менш было «параненых мам». Напэўна, і ў мяне ёсць нейкі сіндром. Ведаеце, чым больш жыву, тым больш шкадую, што ў мяне не пяцёра дзяцей. Таму, відаць, мая праца таксама свайго роду служэнне, кампенсацыя сваёй віны.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

# Пяць месяцаў «катаргі»,

## або Як трэба выбіраць аўташколу

**Гэтым летам я з чыстым сумленнем зняла знак «70» з задняй шыбы сваёй «Стэпачкі» (так мая свякроў назвала нашу Renault Sandero Stepway). Два гады з моманту атрымання запаветнага пасведчання кіроўцы праляцелі незаўважна. Але тыя амаль восем месяцаў (навучанне ў аўташколе замест трох месяцаў расцягнулася да пяці) пакутлівага шляху да мары я, відаць, буду памятаць да канца жыцця.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Выбіраць аўташколу трэба, як мужа (жонку). З не меншай адказнасцю. Цяпер я гэта ведаю дакладна. З выбарам аўташколы могуць дапамагчы водгукі на форумах і іх рэйтынгі (http://adrive.by/study/schools/schools.asp) на падставе каэфіцыента здач і нездач.

Але, калі шчыра, аўташколу я зусім не выбірала. Падала дакументы ў першую сустрэчную. Па-першае, яна была за пяць хвілін хадзьбы ад працы (праўда, на практычныя заняткі даводзілася дабірацца значна далей). Таму **пры выбары аўташколы раю звярнуць увагу і на размяшчэнне аўтадрома).** Па-другое, навучанне там каштавала крыху танней, чым у сярэднім па горадзе. У выніку на ўласнай скуры зразумела сутнасць прыказкі: «Скупы плаціць двойчы». Бо пасля таго як з другой спробы ў мяне не атрымалася здаць «пляцоўку» ў ДАІ, давялося браць дадатковыя заняткі. За адну гадзіну кіравання па горадзе інструктар браў два гады таму рублёў 30 (зараз, калі верыць шматлікім прапановам на сайтах, сітуацыя асабліва не змянілася).

Абвестак пра дадатковыя заняткі з інструктарамі-прыватнікамі хапае. Але я з уласнага досведу **раю кіравацца метадам «сарафаннага радыё»** (бо я засталася незадаволенай заняткамі інструктара, якога знайшла па аб'яве ў інтэрнэце, у выніку выкінула 30 рублёў на вецер). Сяброўка мне параіла прафесіянала, дзякуючы якому яна здала іспыт у ДАІ з першага разу. У выніку пасля трох заняткаў з ім я таксама без праблем здала і «пляцоўку», і «горад». **Прасіце інструктара, каб за дзень да іспыту праехаўся з вамі хоць бы па самых асноўных маршрутах ДАІ, пры гэтым звяртайце ўвагу на знакі.**

**Вельмі важна здаваць экзамен у ДАІ на машыне, на якой вы хоць бы раз ездзілі. Гэта палова поспеху.** Бо калі я пайшла здаваць «пляцоўку» другі раз, то вельмі хвалявалася. Хвілін трыццаць прапускала ўсіх. У выніку ў адчаі села за руль вялізнага чорнага джыпа, на якім пасля сваіх школьных «Жыгулёў» нават на эстакаду не змагла заехаць. Можна было, вядома, дамовіцца са сваёй аўташколай, каб далі машынку для паўторнай здачы (каштуе амаль 25 рублёў). Але ў мяне, калі шчыра, ну зусім не было жадання яшчэ раз бачыць свайго інструктара.

З імі, мяркуючы па расказах знаёмых, не шанцуе многім. **Мне ж не пашанцавала ўдвая. Як з інструктарам, так і з выкладчыкам тэорыі.** Апошні, замест таго каб тлумачыць і прыводзіць прыклады, проста чытаў нам уголас Правілы дарожнага руху з кніжачкі. У выніку тэорыю з нашай групы здалі чатыры чалавекі. Меня выратавалі прывітая з дзяцінства ўседлівасць і «сіндром выдатніцы».

Вельмі важны момант: **калі сядзеце за камп'ютар, ні ў якім разе не абарочвайцеся і не глядзіце па баках.** Казалі, што быў выпадак, калі адзін мужчына аклікнуў свайго суседа. Той толькі паспеў павярнуць галаву, як абодвух выгналі з класа і паставілі нездачу. У выніку справа скончылася... бойкай, ледзь разнялі тых курсантаў.

> ☺ АНЕКДОТ У ТЭМУ
> **Жанчына пайшла вучыцца ў аўташколу. Інструктар мала таго, што пастаянна падкручвае руль, дык яшчэ і тармазіць за яе. Неяк раз ён вырашыў правучыць курсантку. Маўляў, не буду тармазіць. Няхай ужо сама. Пад'язджаюць да перакрыжавання. Ён разумее, што зараз будзе аварыя. І што ёсць моцы націскае на педаль тармазу. Глядзіць на курсантку: «Чаму ты не тармазіла?» — «Ды не ведаю, раней машына неяк сама спынялася».**

Інструктар — гэта асобная гісторыя. Пачалося ўсё з таго, што на першых занятках ён сказаў мне расчышчаць аўтадром ад снегу, а сам у гэты час сядзеў у машыне і запаўняў дакументы. На шчасце, да наступных заняткаў снег растаў і мне не прыйшлося даказваць, што я гэтага не павінна рабіць. Ніколі не забудуся, як мы ўпершыню выехалі ў горад. Я адразу ж зрабіла нейкую памылку. І што тут пачалося! Мой інструктар павышаным голасам запатрабаваў, каб я выходзіла з машыны. Маўляў, занятак завершаны. Пры гэтым абражаў: «Ды такіх, як ты, наогул нельга выпускаць на дарогу». Намякаючы, што самы час, пакуль не позна, забраць дакументы. (Аказваецца, адну жанчыну гадоў 50 з нашай групы ён выжыў сваімі непедагагічнымі метадамі.) Я, вядома, не выйшла з машыны. Пасля гэтага здарэння адмовілася распісвацца ў яго журнале перад заняткамі.

Знаёмыя раілі мне напісаць заяву, каб памяняць інструктара. Але ў той аўташколе іх было ўсяго тры. І мой аказаўся не самым горшым. Бо адзін курыў у салоне машыны, што для мяне наогул было непрымальна, другі — гоншчык — якраз у той час трапіў у ДТЗ, і яго машына доўга была ў рамонце.

Хоць, калі шчыра, і **мая вішнёвая «дзявятка» аказалася тым яшчэ падарункам.** Рэмень бяспекі не прышпіляўся. «Накінь яго проста на сябе, калі ўбачыш даішнікаў», — казаў мне інструктар. Так я і праездзіла ўсе свае гадзіны без рэменя бяспекі. На просьбу зрабіць з гэтым што-небудзь, бо мне нязручна, інструктар не рэагаваў. Але як толькі прыйшоў час здаваць іспыт у ДАІ, той рэмень бяспекі, як па ўзмаху чарадзейнай палачкі, пачаў прышпіляцца. А аднойчы, калі мы ехалі па даволі ажыўленай вуліцы, у маіх руках застаўся рычаг пераключэння передач. Інструктар сказаў: "Не звяртай увагі" — і ўставіў яго назад. На эстакаду амаль не пускаў. Маўляў, спаліш мне счапленне, не будзе на чым у ДАІ ехаць. Але ж як тады вучыцца? Карацей, хадзіла да яго на заняткі як на катаргу.

У маёй сястры таксама першыя заняткі замест адведзенай гадзіны доўжыліся хвілін 30 ад сілы. Калі інструктар сказаў ёй, што яна свабодная, Наташа здзівілася: «Мне дырэктар аўташколы казаў, што практычны занятак доўжыцца гадзіну». — «А ты хочаш цэлую гадзіну займацца?» — пачула ў адказ. «Ну, я ж сюды вучыцца прыйшла, як-ніяк. Грошы нават заплаціла». Пасля гэтага больш пытанняў не ўзнікала.

**Варта мець смеласць давесці да нядбайнага інструктара свае сур'ёзныя намеры. А змяніць інструктара, які неадэкватна сябе паводзіць, злівае паліва, недапрацоўвае, курыць у салоне, дрэнна вучыць — законнае права навучэнца.**

Што датычыцца аўташколы, то наша група нават унутраны іспыт у горадзе не здавала. Толькі «пляцоўку». І то не на сваёй машыне, бо яна зламалася. А дадатковая трэніроўка перад экзаменам у ДАІ была б не лішняй.

**Перад здачай у ДАІ раю выспацца і добра выглядаць.** Бо фотаздымак, які зробяць перад тэарэтычным іспытам, усе дзесяць гадоў будзе красавацца на вашым пасведчанні. **Не забудзьцеся прышпіліцца і зняць ручнік пры старце.** Мая сястра не змагла здаць экзамен у ДАІ з першага разу, бо... пасля таго як бездакорна выканала два элементы — «эстакаду» і «гараж», — на радасцях узяла і заглушыла машыну (а гэтага рабіць ні ў якім разе нельга!!!). Ёй сказалі прыйсці наступны раз. Было вельмі крыўдна.

**Правы кіроўцы па-беларуску: прасіце — і атрымаеце.** Пасля таго як вы здалі практычны экзамен у горадзе, галоўнае, не губляць кантроль над сабой ад радасці. І не забудзьце сказаць інспектару ДАІ, што вы хочаце атрымаць пасведчанне кіроўцы на роднай мове. Ён зробіць на вашых дакументах пазнаку аб вашым жаданні. І ўжо праз некалькі дзён вы зможаце любавацца сваім беларускамоўным пасведчаннем.

Ну, і апошняе: **першай справай, калі купіла «Стэпачку», я паставіла задні парктронік.** У параўнанні з коштам машыны ён не такі і дарагі. Гэта цудоўнае прыстасаванне дапамагло мне пазбегнуць працьмы ДТЗ. Нічога ж не вучыць у аўташколе паркавацца ў рэальных умовах. Толькі па метках на шкле. А гэта неба і зямля. Таму пасля таго як атрымаеце правы, многаму прыйдзецца вучыцца па-новаму. Прычым удасканальваць сваё майстэрства трэба ўсё жыццё. Раю глядзець ролікі на Ютубе, аналізаваць чужыя ДТЗ, каб пазбегнуць сваіх. Дарога часта карае за легкадумнасць. Кожная памылка можа стаць апошняй.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

## ЯК ПАЗБАВІЦЦА АД СТРАХУ ПЕРАД МАШЫНАЙ

Сем ПАРАД кіроўцам-пачаткоўцам ад майстра спорту і неаднаразовага чэмпіёна Беларусі па аўтаралі, дырэктара цэнтра контраварыйнай падрыхтоўкі Сяргея АЎЧЫННІКАВА

**Парада 1.** Абавязкова **набудзьце відэарэгістратар.** Тады вы зможаце, пасля таго як прыехалі дадому, скінуць запіс на камп'ютар і прааналізаваць свае і чужыя памылкі.

**Парада 2.** Перш чым выязджаць з дому, **паглядзіце па карце свой маршрут.** Калі вы ведаеце дарогу і размяшчэнне знакаў, тады ехаць ужо не так страшна.

**Парада 3.** Прыходзіць да мяне на заняткі жанчына і кажа: «Я паркавалася ў двары і падрапала машыну. Гляджу — не ўпісваюся, і давай хуценька руль круціць». Машына — не месца для мітусні і рэзкіх непрадуманых рухаў. Недарэмна кажуць: цішэй едзеш — цалейшы будзеш. Крыху праехалі, націснулі на тормаз, перакаваліся, што дакладна праходзіце. Вы не павінны паспяваць за машынай. **Едзьце і паркуйцеся з той хуткасцю, пры якой адчуваеце, што кантралюеце сітуацыю.**

**Парада 4.** *Пытанне ад нашай чытачкі: «Здала на правы год таму. Але магчымасць набыць машыну з'явілася толькі цяпер. Пасля такога вялікага перапынку баюся садзіцца за руль. Як пераадолець свой страх?»*

Ведаеце, як я сябе прымушаў бегаць узімку? Прачынаўся раніцай. Нагу з-пад коўдры высоўваў і казаў сам сабе: «Не, я, напэўна, сёння бегаць не буду, проста апрануся ды падыхаю свежым паветрам». Выйшаў на вуліцу, стаю. «Неяк халаднавата, я, напэўна, крыху пахаджу». У выніку сам і не заўважыў, як пабег. Калі чалавек едзе, ужо не так страшна. Страшна падысці і сесці ў машыну. Трэба ўмець з сабой размаўляць. Напрыклад: «Я не паеду сёння ў цэнтр. З'езджу ў суседнюю краму па марожанае». **Рухацца трэба ад простага да складанага.** Скажам, большасці кіроўцаў-пачаткоўцаў страшна паварочваць налева, калі на перакрыжаванні шмат машын. Я сваім вучням заўсёды кажу: калі баіцеся — не рызыкуйце. Лепш праедзьце крыху наперад, а затым павярніце направа, направа, і яшчэ раз направа. Такім чынам, замест складанага левага павароту зробіце тры лёгкія правыя. **Трэніраваць складаныя элементы раю па выхадных, калі машын практычна няма.** Акрамя таго, можна пахадзіць на курсы для кіроўцаў-пачаткоўцаў. Іх плюс у тым, што навучанне праходзіць на вашай уласнай машыне.

**Парада 5. Пастаянна думайце і аналізуйце.** На жаль, гэтаму не вучаць у нашых аўташколах (хоць і сярод інструктараў ёсць выключэнні).

**Парада 6. Не раю** жанчынам, якія атрымалі правы кіроўцы, але ўсё яшчэ баяцца ездзіць, **прасіць мужа выступіць у ролі інструктара.** Гэта самы дрэнны варыянт у большасці выпадкаў. Як правіла, пачынаецца ўсё з таго, што яны выязджаюць на паўпустую паркоўку. Жанчына спрабуе прыпаркавацца дыяганальна. Але ў яе нічога не атрымліваецца. Муж не вытрымлівае, пачынае на яе крычаць: «Машыну мне разаб'еш. Не разумею, як ты наогул скончыла аўташколу?» Заканчваецца ўсё тым, што жанчына ў расстроеных пачуццях садзіцца на пасажырскае месца. Муж вязе яе дамоў. Вечар сапсаваны. У наступныя выхадныя ён кажа: «Дарагая, паехалі, я цябе павучу ездзіць». — «Няма часу, трэба прапыласосіць, памыць бялізну...» У галаве ў жанчыны адклаўся негатыўны досвед.

> ☺ АНЕКДОТ У ТЭМУ
> **Як толькі я стала ездзіць за рулём, а муж на пасажырскім сядзенні, — я дакладна зразумела, што такое «ПЕРАШКОДА СПРАВА».**

**Парада 7.** Прапануйце ў суботу сяброўцы ці мужу: «А паехалі сёння ў Раўбічы, пап'ем там кавы». І вось вы едзеце ў добрай кампаніі па загараднай дарозе, свеціць сонейка. **Чым больш гадзін у дзень вы атрымліваеце задавальненне за рулём, тым хутчэй знікне страх і прыйдзе ўпэўненасць.**

■ На сваё вочы

# САКРЭТЫ ЖОЎТАЙ ЖЫРАФЫ,

## або Садок у стылі «ваў»



**Двухузроўневыя групы, скаладромы і вінтавая горка-труба — далёка не ўсе «фішкі» ўнікальнага дзіцячага садка, які з'явіўся ў Новай Баравой пад Мінскам. Над праектам сучаснай дашкольнай установы ламалі галаву не толькі яго забудоўшчыкі, да дыскусій далучаліся архітэктары, псіхолагі, выхавальнікі, бацькі. Некаторыя ідэі падказалі і дзеці. Напрыклад, дзякуючы малым у групах з'явіліся спецыяльныя нішы, дзе можна адасобіцца, пагуляць у хованкі альбо задзейнічаць іх у іншых гульнях. І хочацца верыць, што многія задумы, якія былі тут рэалізаваныя, у будучыні пачнуць улічваць і распрацоўшчыкі іншых праектаў дзіцячых устаноў.**



Фота БЕЛТА.

«Жоўтая жырафа» — менавіта такую назву мае садок — зможа прыняць 150 выхаванцаў. І сустракаць іх на ўваходзе будзе менавіта сяміметровая фігура гэтай аблавухай жывёліны. Але падчас тэст-прэзентацыі ўстановы першае, на што звярнулі ўвагу маленькія «эксперты», — гэта горка, якая дазваляе спускацца з другога паверха, і скаладром, дэталі для якога дапамагалі падбіраць прафесійныя альпіністы.

У юных мастакоў будзе і свая мастацкая галерэя, прычым з падсветкай. Звычайна дзіцячыя работы вісяць унутры групы, а ў «Жоўтай жырафе» — усе калідоры прыстасаваныя для таго, каб там размяшчалася своеасаблівая экспазіцыя.

Старэйшых дзяцей чакае сюрпрыз — асобны гульнявы комплекс з сеткамі-батутамі — абсалютна бяспечнымі, як запэўніваюць забудоўшчыкі. Шнур, з якога сплецена сетка, можа вытрымліваць да 400 кілаграмаў. Трэба сказаць, што гэта першы і пакуль адзіны ў Беларусі садок з двухузроўневымі групамі, але ўжо сёння будуецца яшчэ адна дашкольная ўстанова, дзе будзе выкарыстаны такі падыход для стварэння дадатковай гульнявой плошчы.

Юны экскурсавод, які адрэкамендаваўся Раманам Віктаравічам, правёў першых гасцей садка па ўсіх памяшканнях. Мы зазірнулі ў прасторную спартыўную залу, медыцынскі блок (дзе ёсць у тым ліку ізалятар з асобным выхадам) і, зразумела, на кухню. Тут даведаліся, што для разнастайных прадуктаў, якія дастаўляюцца ў садок, працуюць свае халадзільнікі. Тое ж і з прыгатаваннем: у адным пакоі кухары чаруюць з агароднінай, у другім — разбіраюць рыбу і мяса, у трэцім — гатуюцца гарачыя стравы. І на сучасным абсталяванні можна ствараць для маленькіх гурманаў ежу не горшую, чым у рэстаранах. Гатовая, яна будзе паступаць у спецыяльных кантэйнеры, якія дазволяць захоўваць яе цёплай. Ёсць тут і ліфт, які дастаўляць ежу на другі паверх.



«Гэты праект для нас незвычайны, адзін з самых складаных, творчых, у які было ўцягнута больш за ўсё людзей, — заўважае **Святлана ШЭЎЛІК — дырэктар кампаніі «А-100 Дэвелапмент»**, якая працавала над праектам садка будучыні. — Зразумела, на тварах ва ўсіх, хто сюды заходзіць, можна ўбачыць здзіўленне: ніхто не мог уявіць, што падобны садок з'явіцца ў Беларусі. Але мы імкнуліся стварыць не проста прыгожую архітэктуру, для нас важна, каб кожны элемент выконваў нейкую функцыю».

І сапраўды, тут шмат дэталяў, якім выхаванцы змогуць знайсці разнастайнае прымяненне. Нават мэбля ў групах (дарэчы, такой вы больш нідзе не ўбачыце, бо яна стваралася па спецыяльным заказе менавіта для гэтай установы) дазваляе па-рознаму перакройваць прастору, рабіць заняткі непаўторнымі. З тых жа сталоў можна «скласці» вялікія ці малыя кругі. Драўляныя перагародкі, якімі падзелены гульнявая і спальная зоны ў групах, гэта яшчэ і зручныя сядзенні, пад якімі размешчаны персанальныя ячэйкі для кожнага малога. Нават падаконнікі зроблены так, каб на іх можна было сядзець. Уражваюць і вялікія панарамныя вокны, пакоі, напоўненыя святлом, і ствараецца ўражанне, што дзеткі, якія будуць тут бавіць час, ніколі не адчуюць сябе ў замкнёным памяшканні — вось яна, вуліца, як на далоні.

Для самых маленькіх, а яслі знаходзяцца на першых паверхах, прадугледжаны прамы выхад з групы на дзіцячыя пляцоўкі праз вялікія шкляныя дзверы, за якімі абсталяваны драўляныя тэрасы.

Між іншым, калі мы ўжо выбраліся на прагулку, як не звярнуць увагу на абсталяванне. Яно таксама ўнікальнае — упершыню ў Беларусь былі дастаўлены вялікія гульнявыя пляцоўкі ад вядучага еўрапейскага вытворцы дзіцячых комплексаў. Выкананыя з натуральных матэрыялаў, яны зноў жа шматфункцыянальныя — дзеці змогуць прыдумаць многа разнастайных гульняў. Тут вы ўбачыце альтанкі, качалкі, балансіры і нават спецыяльныя кветачніцы, у якіх малыя змогуць вырошчваць расліны. Пясочніцы зробленыя так, каб імі маглі карыстацца нават дзеці з інваліднасцю. А будучым кіроўцам прыйдзецца даспадобы пляцоўка для вывучэння правілаў дарожнага руху з уласнай міні-запраўкай. На тэрыторыі ёсць нават асобная пабудова для захоўвання веласіпедаў, самакатаў і санак, на якіх дзеткі прыбываюць у садок.

Ды і сам фасад будынка ўражвае — быццам нейкі чараўнік рассыпаў па ім рознакаляровыя гарошынкі.

Садок знаходзіцца ў цэнтры квартала — побач з цэнтральнай пешаходнай плошчай і фантанам, і, зразумела, забудоўшчыкі, каб зрабіць гэты знакавы аб'ект яшчэ больш яскравым, паклапаціліся пра дэкаратыўную начную падсветку.

Ужо ў хуткім часе садок перадаецца на баланс дзяржаве, якая і будзе фарміраваць групы. Але жыхарам Новай Баравой не трэба хвалявацца, што месцаў можа не хапіць. Увогуле тут плануецца пабудаваць восем дашкольных устаноў, а ў найбліжэйшы час будзе здадзены яшчэ адзін незвычайны садок, аформлены ў касмічнай тэматыцы. У 2019-м, абяцаюць, пачне працаваць і «школа будучыні».

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ**

■ Фотаздымак з гісторыяй

# РАДАСЦЬ БЫЛА... КАРОТКАЯ

**Па традыцыі ў лютым ладзяцца ўрачыстыя вечары сустрэч выпускнікоў школ. З маіх аднакласнікаў выпуску 1957 года засталіся ўжо лічаныя асобы, ды і тых жыццёвы лёс раскідаў па свеце: Эстонія, Латвія, Сібір, Украіна, Польшча. Апошняя сустрэча, хоць у няпоўным складзе, адбылася ў 2002 годзе, адзначылі 45-гадовы юбілей. Больш сабрацца не здолелі, толькі зрэдку размаўляем па тэлефоне. Нядаўна праглядаў свае школьныя фотаздымкі. І ў памяці пачаў пракручвацца, бы кінастужка, лёс майго аднакласніка Яўгена Нікіфарава. На здымку чацвёртага класа ён стаіць чацвёрты злева (я ж сяджу басаног, за мной у белым каўнерыку Галя Мароз — толькі мы з ёй змаглі закончыць сярэднюю школу і атрымаць педагагічную адукацыю).**



Дык вось, у пачатку 1944 года немцы эшалонам і абозамі везлі дзяцей з-пад Ленінграда ў Германію. Але ў выніку наступлення савецкіх войскаў вымушаны былі разгрузіць эшалон на станцыі Дукшты ў Літве для эвакуацыі параненых. Дзеці шукалі прытулак, як хто змог. Жыхары Відзаў, Браслава, Друі і навакольных вёсак бралі пад апеку гаротнікаў. Марыя Нарушэвіч з Друі, маці якой жыла ў Мілашове, узяла хлопчыка ў Браславе і прывезла да маці. Жэня, якому ішоў восьмы год, стаў памочнікам, дакладней работнікам у гаспадарцы Альжбеты Панізнік — жанчыны ўладарный, нават жорсткай. Яе гаспадарка патрабавала цяжкай фізічнай працы, якая і лягла на яшчэ кволыя дзіцячыя плечы. Некалькі разоў, не вытрымаўшы нагрузак і пакаранняў, хлопчык збягаў ад «бабушкі», як ён называў сваю «апякунку», пасвіў кароў на суседніх хутарах, але да зімы вяртаўся зноў.

Мы жылі па-суседску. У мяне было пяць сясцёр і старэйшы брат (на жаль, я, як самы малодшы, застаўся ўжо толькі адзін). Жэня пастаянна знаходзіў у нашай сям'і спагаду і падтрымку, ніколі не быў лішні і за сталом, не вельмі багатым на той час. Памятаецца, як ён, жнучы сярпом жыта, зняў кашулю і да вечара абпёк на сонцы спіну да вадзяных пухіроў. Мама тады змазвала раны вяршкамі і прыкладвала трыпутнік. Іншых лекаў не было.

У 1951 годзе Жэня скончыў чатыры класы Мілашоўскай школы, далей вучыцца «бабушка» не пусціла: «Досыць карміць дармаеда, выкарміла, як брыся». Жэня стаў працаваць ва ўжо створаным у 1949 годзе калгасе «Палітаддзелец», пазней яго прызначылі брыгадзірам. У 1956 годзе прызвана на вайсковую службу ў горад Курган, атрымаў правы кіроўцы, працаваў шафёрам аўтобуса, стварыў сям'ю. У 1963 годзе Жэня даслаў нашай сям'і радасную вестку: ён знайшоў і сустрэўся са сваёй маці і сястрой, якіх страціў у гады ліхалецця. Яны былі вывезены ў Германію. Яшчэ калі ён хадзіў у школу, настаўнікі спрабавалі знайсці яго родзічаў, але безвынікова. Сам ён ведаў, што жылі яны ў горадзе Волхаўбуд, памятаў вуліцу. Бацька Канстанцін у той час быў на фронце. Жэню з бабуляй немцы захапілі. Маці ж удалося схавацца з трыма дзецьмі. Бабулю на вачах хлопчыка немцы павесілі за рэбры (так ён запомніў) за спробу ўцячы з-пад агароджы з калючага дроту. Далейшы лёс малога пакутніка быў звязаны з вёсачкай Мілашова Мёрскага раёна.

На жаль, радасць сустрэчы з маці і сястрой (двое братоў зніклі без вестак) была вельмі кароткая, як і жыццё Яўгена Нікіфарава. Сэрца маладога мужа, сына і брата не вытрымала. Занадта шмат пакут і выпрабаванняў выпала на яго долю.

У 1964 годзе Жэні не стала, а ён збіраўся прыехаць з сям'ёй адведаць нас і, як пісаў, тыя мясціны, дзе прайшлі цяжкія, але дарагія дзіцячыя і юнацкія гады.

**Альфрэд ТЫЧКО,**
*в. Ідолта, Мёрскі раён*

***Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома. Здымкі (не больш за тры) з невялікай гісторыяй дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск або info@zviazda.by. Найлепшая аўтара чакае прыз. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца***

# ЗАКІНУЛІ ЗАЙЦА

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар «СГ».)*



Пакуль у двары жаніха запрагалі коніка ў вазок — маладой надзелі вясельны ўбор. Потым дзяўчыну пасадзілі на дзежку і шаферка (ролю якой выконвала начальнік аддзела ЗАГС Клімавіцкага райвыканкама Алена Навумава) расчэсвала пад абрадавыя песні валасы і надзела вэлюм. Пасля па старой традыцыі дзяўчаты выкінулі тую дзежку на вуліцу. Гэта дзеянне сімвалізавала іх хуткае вяселле.

За акном пачулі, як да дома пад'ехаў жаніх. Дзяўчаты выйшлі на ганак, пачаўся выкуп нявесты. Як ні стараліся мужчыны, жанчыны не хацелі страціць на выкупе. Калі торг падышоў да канца, усе расселіся ў сані. Вупраж загадзя была ўпрыгожана яркімі стужкамі і паясамі. На дугах віселі званочкі, на шыях коней — шурхалы (звязкі званочкаў).

Коні жвава панеслі вясельны картэж у суседнюю вёску. Там, у Сідараўцы, мясцовыя жыхары «закінулі зайца». Прычым усё па звычаі — лаўка, накрытая ручніком, хлеб-соль і вядро з вадой, каб напаіць коней. Усе з добрым настроем вырашылі наведаць і вёску Мыслеўшчына. Тут таксама чакалі гасцей.



Вярнуўшыся ў Судзілы, маладыя і госці селі за стол, які ўгінаўся ад традыцыйных страў. Тут і квашаніна, і вінегрэт, і блінцы з грыбамі і капустай, і тварожнікі ў алеі са смятанай, кісель, розныя саленні і, вядома ж, тушаная бульба з печы. Госці спявалі мясцовыя абрадавыя песні пад гармонік, дарылі падарункі з жартамі і прымаўкамі.

Паводле звычаю на другі дзень вяселля нявеста ішла ў калодзеж па ваду. Сваякі жаніха ўважліва сачылі за дзеяннямі новай сваячкі. Удзельніца абраду Валянціна Багуцкая з вёскі Сідараўка ўспамінала, як некалі яе адправілі па ваду.







— Я прыйшла да крыніцы, — расказвае яна. — На край зруба паклала хлеб-соль. Набраўшы вады, на каромысле панесла яе ў дом. Несці было цяжка, пад горку. У гэты час усе назіралі за мной — ці не разальлю ваду. Але я справілася.

І гэтыя дзеянні ўзнавілі пры рэканструкцыі абраду. Спрытна набраўшы два вядры вады з калодзежа, нявеста ўпэўненым крокам пайшла дадому. Насустрач жаніх з шаферам везлі на санках цешчу. Параўняўшыся з нявестай, мужчыны памылі твар жанчыны, а затым усе змаглі выпіць сцюдзёнай вадзіцы.

Беларускае вяселле — унікальны абрад, які мае сакральны сэнс. Усе яго этапы былі старанна прадуманы, як у добрым спектаклі. Прычым кожнае дзеянне не выпадковае, а павінна прынесці шчасце, лад і дастатак у сям'ю маладых.

— Яшчэ гадоў пяцьдзясят таму гэтая традыцыя была неад'емнай часткай мясцовага побыту, — кажа Аляксандр Галкоўскі. — Цяпер — гэта дзіва. Уборы, сані і вазкі, традыцыйныя песні — іх можна ўбачыць і пачуць толькі на пастановачных абрадах. Хоць жывыя тыя носьбіты, хто можа арганізаваць вяселле на ўзор продкаў, мясцовая моладзь, на жаль, па параду да старэйшых ужо не спяшаецца.

— Калі раней малодшыя з малаком маці ўбіралі звычаі продкаў, то цяпер норавы змяніліся: настаўнікі засталіся, а вучняў не знайсці, — кажа ўдзельнік абраду, **старшы навуковы супрацоўнік Клімавіцкага краязнаўчага музея Уладзіслаў МІЦІЧАЎ.** — Чаму? Складанае пытанне. Напэўна, па той жа прычыне, па якой маслабойкі і жаравыя прасы паступова пераязджаюць на стэлажы этнаграфічных залаў у музеі.

Дарэчы, ідэя аднаўлення беларускага абраду з'явілася, прызнаюцца супрацоўнікі Клімавіцкага краязнаўчага музея, калі яны арганізавалі выстаўку вясельных фотаздымкаў і адзення, прымеркаваную да 100-годдзя органаў ЗАГС.

**Дар'я ЭВЕРС.**
**Фота Надзеі САБІРАВАЙ.**
*Клімавіцкі раён.*

---

## Сямейная пошта

## КАМПЛІМЕНТ

Васьмігадовы Кірыл, сярэдні з трох маіх пляменнікаў, — чалавек надзвычай сур'ёзны: засяроджаны, самавіты, слоў на вецер ніколі не кідае. Затое ўжо як скажа — дык хоць ты стой, хоць падай (часам — яшчэ і ад смеху)...

Ну вось напрыклад. Ідзём мы неяк раз па вясковай вуліцы (трэба ж, каб ён падыхаў чыстым паветрам, каб даў адпачынак вачам ад розных там гаджэтаў), паціху размаўляем. Я распытваю ў малога пра школу (якія прадметы падабаюцца, з кім сябруе і г. д.), ён стрымана адказвае, а затым ужо сам цікавіцца:

— Цёця Іра, а колькі табе гадоў?

— Сорак, — кажу і пажаночы ўдакладняю, — гэта многа?

— Ды не... Я проста забыўся колькі, — дыпламатычна заўважае малы і праз некалькі секунд выносіць «вердыкт», — але выглядаеш ты на трыццаць дзевяць, не больш!..

Шкада, няма такіх слоў, каб дакладна перадаць тон, з якім вымаўлялася лічба. Па-першае, было адчуванне, што яе называў не хлопчык, а дарослы мужчына... Па-другое, гэтае «трыццаць дзевяць» гучала так, нібы насамрэч мне дзевятнаццаць і ні годам больш!

...Кім пляменнік стане, калі вырасце, загадваць пакуль што рана. Але ж навуку гаварыць кампліменты ён ужо засвоіў, прычым на выдатна.

**Ірына МАТУСЕВІЧ,**
*Дзяржынскі раён.*

## ГАЮЧЫЯ КАРУНКІ

Мая старая прасціна зусім разлезлася і рамонту ўжо не падлягала. Таму, пакруціўшы яе ў руках, я сумна ўздыхнула і, узброіўшыся вострымі нажніцамі, хуценька ўзялася за справу...

Праз некаторы час у руках засталіся адны карункі. На памяць. Я іх акуратна ўпакавала ў пакецік ды схавала ў шафу. Выкінуць не змагла. Таму, што гэты цуд калісьці зрабіла мая мамуся. Узоры прыдумвала сама, зрэдку «пазычала» нешта ў суседкі. Карункі былі цудоўныя!

Калі раптам сум возьме ў палон сэрца, я іх прытулю да шчакі... І адразу зробіцца лягчэй. Тут дзівіцца няма чаго! Энергетыка роднага чалавека — найлепшы лекар ад суму і хвароб.

**Ганна АТРОШЧАНКА,**
*г. Гомель.*

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего на праве собственности ОАО «Белхим»

**Лот №1.** Здание административно-бытового корпуса с инв. № 620/С-840. Адрес: Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 25. Назначение: здание административно-хозяйственное. Г. п. – 1975. Этажность – 3. Общая площадь – 2 132,7 кв. м. Составные части и принадлежности: целое трехэтажное здание административно-бытового корпуса из железобетонных стеновых панелей (БЗ/п).

**Начальная цена – 961 200,00 бел. руб. с учетом НДС 20 %.**
**Задаток – 50 000,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %**

ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК

Земельный участок площадью 0,3278 га с кадастровым номером 622250600001002017. Целевое назначение земельного участка: для обслуживания здания административно-бытового корпуса. Право постоянного пользования. Ограничения (обременения) прав на земельный участок: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 В, площадь 0,0270 га.
Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

| **Дата, время и место проведения аукциона:** 18.04.2018 в 10.30. по адресу: г. Толочин, ул. Ленина, 1 в Толочинском райисполкоме. Срок внесения задатков и приема документов: с 15.03.2018 с 8.30 по 14.04.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. **Реквизиты для внесения задатка: по лотам 1, 2:** р/с BY84AKBB36003270095710000000 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ по Витебской области (Толочинский райисполком); **по лоту 3:** р/с BY57AKBB36003270895590000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901. Получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Толочинский сельисполком). Для участия в аукционе приглашаются граждане, консолидированные участники (двое и более граждан) Республики Беларусь. **Условия аукциона:** получить разрешительную документацию на строительство жилых домов в Толочинском райисполкоме; до начала строительства снять плодородный слой почвы в местах размещения строений и сооружений и использовать его на улучшение приусадебного участка; **по лотам 1, 2:** в течение 6 месяцев (для юр. лиц) и 1 года (для физ. лиц) со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания зем. участка и возникновения прав на него приступить к занятию предоставленного зем. участка в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство) и закончить строительство жилого дома в течение 3 лет с даты осуществления гос. регистрации права частной собственности на зем. участок, **по лоту 3:** в течение 1 года со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания зем. участка и возникновения права на него приступить к занятию предоставленного зем. участка в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство). Для участия в аукционе приглашаются **по лотам 1, 2:** граждане, негосударственные юр. лица, консолидированные участники (двое и более граждан, негосударственных юр. лиц Республики Беларусь); **по лоту 3:** граждане, консолидированные участники (двое и более граждан) |

Аукционы проводятся в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. **Для участия в аукционе** граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/с, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан, уполномоченные лица (представители) – документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; обратиться за гос. регистрацией права на зем. участок в двухмесячный срок со дня проведения аукциона (утверждения протокола о результатах аукциона). Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос.регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Конт. тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by

■ Смачна есці!

# НА СТАЛЕ — ЗЕМЛЯНАЯ ГРУША

## Карэспандэнты «Звязды» пакаштавалі стравы «новай беларускай кухні»


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**У халадзільніку любой гаспадыні час ад часу з'яўляюцца прадукты «пра запас». Напрыклад, учарашняе бульбяное пюрэ альбо некалькі пакетаў замарожаных ягад, што яшчэ восенню перадалі знаёмыя. Можна пайсці лёгкім шляхам і прыгатаваць звычайныя стравы. Аднак тры каманды беларускіх кухараў выбралі іншую дарогу і замахнуліся на стварэнне новай кухні на старажытнай, традыцыйнай аснове. Ніякіх дранікаў, толькі палёт фантазіі. Мы запісалі некалькі рэцэптаў для чытачоў.**

На вуліцы ляжаць гурбы, але душа ўжо прагне вясны. Магчыма, такім настроем натхняліся стваральнікі **крэм-супу з клёцкамі «Вясна блізка»**. У аснове стравы — добравядомае бульбяное пюрэ, да якога дададзены «сакрэтны» інгрэдыент.



Тапінамбур цяпер рэдка сустрэнеш на стале. Часта земляную грушу — так у народзе празвалі гэту расліну — лічаць пустазеллем або скормліваюць свойскай жывёле. Напэўна, нехта з чытачоў прыгадае, як у дзяцінстве ласаваўся саладкаватымі клубнямі.

Дык вось, каб пакаштаваць набліжэнне вясны, спатрэбіцца 500 грамаў тапінамбуру, 500 грамаў бульбы, масла, 1 літр малака, 50 грамаў сала (ці каўбасы), яйка, соль і перац на смак.

Клубні трэба пачысціць, бульбу — зварыць, тапінамбур — запякаць у духоўцы пры тэмпературы 180 °С 15 хвілін.

У каструлі растапіць 100 грам масла, абсмажыць тапінамбур, заліць 500 грамамі вады і дабавіць вараную бульбу. Атрыманую масу варыць, пакуль яна не стане мяккай. Дабавіць у будучы суп-пюрэ малако, закіпяціць. Пасля таго як выключыце агонь, трэба перацерці змесціва каструлі ў аднародную масу (таўкачыкам ці з дапамогай блэндара), пасаліць. Для асаблівага прысмаку кухары раюць выціснуць у страву сок лайму, аднак тут вітаюцца любыя эксперыменты.

Цяпер настала чарга клёцак. Рэшту бульбы перацерці разам з абсмажаным салам, зляпіць невялікія шарыкі, запаніраваць іх у яйка і сухары (або муку), падсмажыць у масле.

Па некалькі клёцак кладзецца ў кожную талерку перад падачай стравы.

### На другое — «Мотальскія гультайкі»

Пасля сытнага супу настала чарга для другога. Гэты рэцэпт прыйшоў з мястэчка Моталь. Тамашнія гаспадары наогул славяцца незвычайным падыходам да гатавання, сем'і захоўваюць рэцэпты асаблівых страў з пакалення ў пакаленне. **«Мотальскія гультайкі»**, напрыклад, забівалі адразу двух зайцоў: на першы дзень пякліся пірагі для ўсёй сям'і, а назаўтра гаспадыні падсілкоўвалі сямейнікаў «гультайкамі» з рэшты цеста.



Для асноўнага складніка спатрэбіцца 650 грамаў мукі, 300 мілілітраў малака, яйка, сталовая лыжка цукру, дробка солі, 20 грамаў дражджэй і 50 грамаў сметанковага масла. З усяго згаданага гатуем цеста, якое потым трэба паставіць у цёплае месца, каб падышло. Якраз ёсць час прыгатаваць соус. Спатрэбіцца 150 грамаў цыбулі (рэпкі), 300 грамаў грыбоў, напрыклад шампіньёнаў, 2-3 часночныя зубкі, 200 грамаў вяршкоў або смятаны, алей і масла. Цыбулю і грыбы нарэзаць, часнок дробна пакрышыць. Абсмажыць усё на алеі з дабаўленнем масла да залацістага колеру, заліць вяршкамі, крыху патушыць. Соус не павінен быць занадта вадкім. Каб надаць яму патрэбную густату, можна выкарыстаць муку.

І зноў вяртаемся да цеста, лепім з яго шарыкі памерам з вішню. Адвараем іх 3-4 хвіліны ў падсоленай вадзе (сачыце, каб кавалачкі не зліпліся). Адкідваем «гультайкі» на друшляк, зноў жа каб не зліпліся, дабаўляем крыху масла і засыпаем у соус. Страву трэба яшчэ крыху пратушыць або запячы перад тым, як падаваць на стол.

### А на дэсерт — кулага з жэле

Што датычыцца дэсерту, то эксперт беларускай кухні Алена Мікульчык можа адсачыць яго карані ажно з паганскіх часоў. Нашы продкі вельмі сур'ёзна ставіліся да кулагі, бо гэта была абрадавая, ахвярная ежа.

У сучасным варыянце кухары вырашылі да традыцыйнага складніку дабавіць жэле з вяршкоў. У выніку атрымаўся смачны, просты ў прыгатаванні і вельмі прыгожы дэсерт. Для кулагі спатрэбіцца 400 грамаў ягад (чарніц, суніц, малін і г. д.), 80 грамаў жытняй мукі, прыкладна 100 грамаў мёду. Для жэле — 400 мілілітраў вяршкоў, 60 грамаў цукру, 15 грамаў жэлаціну, ванілін, халодная вада.



Напачатку прыгатуем жэле. У сатэйніку змяшаем вяршкі, цукар і ванілін. Вадкасць награваем да тэмпературы 80—90 градусаў і дадаём замочаны папярэдне ў вадзе жэлацін такім чынам, каб ён поўнасцю растварыўся ў вяршках. Тут трэба сачыць, каб наша загатоўка не закіпела, для гэтага пастаянна памешваем страву. Будучае жэле разліце па крэманках або шклянках і пастаўце ў халадзільнік, каб яно загусцела. Не старайцеся выкарыстаць усё за адзін раз, бо дэсерт з кулагай можна рабіць слоеным.

Свежыя альбо размарожаныя ягады засыпце ў каструлю ці сатэйнік, заліце іх невялікай колькасцю вады (прыкладна 80 грамаў). Нагрэйце на сярэднім агні да кіпення, а затым разамніце ў пюрэ, але не трэба імкнуцца да аднароднай масы.

Зноў ставім каструльку на агонь і дабаўляем муку. Сумесь варым літаральна 1-2 хвіліны, пакуль змесціва не загусцее, як аўсяная каша. Выключаем агонь і даём астыць да 60—70 градусаў. Перамешваем з мёдам. Цяпер у посуд з жэле дабаўляем слой кулагі. Чым больш слаёў з вяршкоў і ягад, тым больш прыгожа будзе выглядаць дэсерт.

Аўтары новай беларускай кухні раяць адпусціць фантазію і даверыцца ўласнаму густу: калі вам не да смаку нейкі інгрэдыент — смела замяняйце яго. Больш рэцэптаў арыгінальных страў можна знайсці на сайце http://kuhnia.prostokvashino.by.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

## УМЕЛЫЯ РУЧКІ

### Ляжанка для кошкі

**Для многіх кошкі — гэта паўнапраўныя члены сям'і. Значыць, калі ў кожнага дамачадца ёсць сваё спальнае месца, то і ў любімца павінен быць ложак.**



***Спатрэбіцца:** стары ваўняны світар, напаўняльнік халафайбер (можна выкарыстоўваць непатрэбную падушку).*

Зашыйце гарлавіну світара, вывернуўшы яго навыварат, і адштабнуйце на вышыні выразаў для рукавоў, каб атрымаўся адзіны борцік. Набіце борцік напаўняльнікам. Сшыйце манжэты рукавоў паміж сабой. Унутр астатняй часткі світара ўкладзіце круглую падушку ці напаўняльнік і злучыце ўсё з рукавамі. Атрымалася прыгожая і зручная ляжанка.



Хутчэй за ўсё, ваша кошка не будзе супраць доміка з дахам і невялікай адтулінай для ўваходу. А зрабіць яго даволі проста. І спатрэбіцца для гэтага некалькі вешалак з дроту, на якіх часта выдаюць рэчы з хімчысткі, і проста кавалкі дроту, а яшчэ непатрэбная фуфайка і мяккая падушка.

## КУЛІНАРНЫЯ ХІТРЫКІ



• Ідэальную яечню лепш гатаваць не толькі на алеі, але і з дадаваннем вады. Разбіце яйкі на разагрэтую патэльню. Калі бялок пачне застываць, уліце ў патэльню зусім трошкі вады. Яечня не будзе прыгараць, і яе смак стане больш далікатным. Акрамя таго, страва ў такім выглядзе будзе больш карысная.

• Каб цыбуля страціла горыч і яе смак стаў нашмат больш далікатны, замачыце яе ў халоднай вадзе на 15 хвілін перад тым, як дадаць у салату.

• Перад тым як зварыць каву, дадайце дробку солі і столькі ж карыцы. Напой набудзе асаблівы смак і водар! Таксама можна дадаць сушаную молатую цэдру лімона або апельсіна.

• Заўсёды дадавайце соль у цеста, нават калі яно прызначана для салодкіх пірагоў. Нават у салодкай выпечцы дробка солі палепшыць якасць цеста: вырабы будуць лепш трымаць форму, будуць пругкімі і набудуць больш багаты смак.

• Дадавайце ў фарш паніровачныя сухары замест хлеба. Тады катлеты будуць больш сакавітымі і смачнымі.

• Абсыпце кавалачкі мяса сумессю кукурузнага крухмалу і яечнага бялку. Гэта надасць яму далікатную тэкстуру, паменшыць магчымасць прыгарання або высыхання. Можна зрабіць і марынад на гэтай аснове, дадаўшы да сумесі бялку і крухмалу бальзамічны воцат.

*КАЛІ ТЫ ЗДОЛЬНЫ БАЧЫЦЬ ПРЫГОЖАЕ, ТО ТОЛЬКІ ТАМУ, ШТО НОСІШ ПРЫГОЖАЕ ЎНУТРЫ СЯБЕ (Паўла Каэлья).*

Адказная за выпуск Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

■ Сугучча

# З АДКАЗНАСЦЮ ПЕРАД СВЕТАМ

**Мікола МЯТЛІЦКІ — вядомы ў Беларусі паэт і перакладчык. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь. Лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры. Шмат часу ў сваім творчым жыцці аддае перакладам паэзіі народаў свету. У свой час розгалас выклікалі анталогія аднаго перакладчыка «Сугучнасць», кніга паэзіі казахскага асветніка, першапраходца на ніве прыгожага пісьменства Абая «Стэпавы прастор». У 2012-м паэт выдаў анталогію «Пад крыламі Дракона: Сто паэтаў Кітая». А параўнальна нядаўна замахнуўся на выданне адной кнігай новых перакладаў з кітайскай паэзіі — і вось толькі што ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» пабачыла свет анталогія «Пялёсткі лотаса і хрызантэмы: 100 паэтаў Кітая XX стагоддзя». Гэтая праца і паслужыла падставай для нашай гутаркі з перакладчыкам.**



Фота Кастуся ДРОБАВА.

***— Мікалай Міхайлавіч, першая анталогія ўмясціла ваша перакладчыцкае асэнсаванне ўсёй кітайскай паэзіі. А новы праект — толькі адно дваццатае стагоддзе... У чым адрозненне, з якімі складанасцямі давялося сутыкнуцца?***

— Да новага праекта я падыходзіў, на шчасце, не ў творчай адзіноце. Дый, прызнацца, такое аднаму не па сіле: можна патануць у акіяне сучаснай кітайскай літаратуры, дзе творчых людзей на сённяшні дзень столькі, як у нашай краіне насельніцтва. Таму мае шчырыя словы ўдзячнасці ўкладальніку анталогіі Алесю Мікалаевічу Карлюкевічу, які здабыў ужо адгранёны дзесяцігоддзямі паэтычны матэрыял. Мы не мелі права проста так аднекуль штосьці браць. Анталогія цэлага стагоддзя абавязвала ствараць вартую, яскравую карціну паўнакроўнага народнага жыцця, захаванага ў мастацкім слове. З усёй упэўненасцю магу адзначыць, што, прачытаўшы «Пялёсткі лотаса і хрызантэмы», чытач адкрые для сябе душу сучаснага Кітая. Дваццатае стагоддзе — гэта падмурак яго станаўлення як новай, яшчэ мала зразумелай чалавецтву краіны-лідара і ў той жа час працяг няспыннага развіцця шматтысячагадовай кітайскай цывілізацыі. Вось і было самым складаным выбудаваць саму духоўную дамінанту гэтага развіцця. На радасць, сапраўдная паэзія дае такую магчымасць.

***— І ўсё ж, калі гаварыць пра паэтычную характарыстыку дваццатага стагоддзя вачыма кітайскіх паэтаў, то якую выснову можна зрабіць?***

— Перш-наперш, паэзія Кітая дваццатага стагоддзя — залаты злітак чалавечае мужнасці. Я не кажу ўжо аб такіх паняццях, як сумленнасць і высокая мараль. Гэта ў даўняй паэтычнай традыцыі. Ва ўсе часы ў Кітаі браліся за пяро самыя таленавітыя і самыя сумленныя людзі. Паэтычнае слова сталася мерай чалавечае годнасці і сумлення. Гэты адвечны закон не парушаны і ў дваццатым стагоддзі. І нам, беларусам, асабліва зразумелы. Не раз і нашы айчынныя паэты пісалі крывёю сэрца.

Да таго ж дваццатае стагоддзе Кітая як бы распалавінена жорсткім мячом барацьбы за дзяржаўную незалежнасць. Мы ведаем, што сучасны Кітай, які развіваецца на вачах усяго свету, быў абвешчаны 1 кастрычніка 1949 года. Дый гэтая, другая палова яго суверэннага існавання даволі заплямлена падзеямі культурнай рэвалюцыі, калі забівалі сумленных паэтаў дубінкамі проста на плошчах. А колькі трагедый лёсаў у першай палове стагоддзя? Хаця б прыгадаць паэта-юнака Інь Фу, забітага гаміньданаўцамі, няспраўджанага генія кітайскай паэзіі, або сусветна вядомага Вэнь Ідо, які загінуў ад здрадніцкай чанкайшысцкай кулі. Мы не акцэнтавалі ўвагі на нейкіх біяграфічных звестках — выбудоўвалі з паэтычных твораў саму народную біяграфію, што значна важней.

***— Сярод іншых паэтаў анталогіі — і Маа Цзэдун. Чым кіраваліся, уключаючы вершы гэтага знакамітага палітыка ў анталогію?***

— Безумоўна, павышаным пачуццём гістарызму. Вершы Маа Цзэдуна — яскравая старонка барацьбы за незалежнасць краіны. Яны напісаныя з вялікім сардэчным цяплом, верай у моц чалавечага духу. Таму такія кранальныя. Чытаючы іх і пасля пераўвасабляючы на беларускую мову, я зусім не думаў пра Маа Цзэдуна як палітыка.

***— Калі гаварыць пра параўнанні, то наколькі адрозніваюцца нацыянальныя паэзіі ў Беларусі і Кітаі ў дваццатым стагоддзі?***

— Вельмі ж ужо судакранаюцца сваімі болевымі кропкамі. Багушэвіч, Цётка, Купала, Колас, Багдановіч... — світальная зара нашай літаратуры. Пярэдадзень дваццатага стагоддзя і яго пачатак у нас, беларусаў, адметны бунтарным паэтычным словам, поўным закліку «людзьмі звацца». І потым, калі пасля кастрычніка сямнаццатага сталі звацца людзьмі, крывавых плямін у нашай гісторыі, на жаль, не паменшала. Наступалі расстрэльныя трыццатыя, а потым — вайна. Лёс многіх беларускіх паэтаў гэтага часу можна назваць па-сапраўднаму трагічным. У кітайскай гісторыі таго ж перыяду засталася свая крывавая барацьба за лепшую долю і волю, свае набыткі і страты. Дваццатае стагоддзе Кітая пачыналася пад раскаты Іхэтуаньскага паўстання супраць абвешчанай ЗША палітыкі «адкрытых дзвярэй». Пасля паражэння паўстанцаў Кітай канчаткова быў ператвораны ў паўкалонію. З 1901 года іншаземцы маглі трымаць у Кітаі свае войскі і флот. З гэтай прычыны ў краіне актывізаваўся нацыянальна-вызваленчы рух, народ Кітая адчуў моцны прыліў змагарнай энергіі...

Як і ў нас, беларусаў, паэзія ў кітайцаў глыбока рэалістычная. А гэта дае падставы амаль фізічна адчуць подаўна страчаны час, вярнуцца ў пражытае і перажытае.

Яднае нас вялікая сіла духу і прага жыцця. І сёння разуменне гэтага нас багата ў чым збліжае і родніць.

***— Як вы асабіста лічыце, ці складваецца нейкая пэўная школа, пэўная традыцыя ў пераўвасабленні кітайскай літаратуры на мову Купалы і Коласа?***

— Гэтай своеасаблівай перакладчыцкай школай усё паўнагучней становіцца выданне паэтычнай серыі «Светлыя знакі: паэты Кітая». Да таго ж няподаўна распачата практыка побач з перакладамі змяшчаць творы і на мове арыгінала, каб зблізіць нашу славянскую кірыліцу з іерагліфічным пісьменствам. Мяне вельмі захапляе, што нашы маладыя калегі ідуць у Кітай з адкрытым сэрцам, многія дасканала ведаюць кітайскую мову. Надыходзіць час адкрыцця і кітайскай прозы, а таксама нарастання зваротных сувязяў — перакладу твораў сучасных беларускіх пісьменнікаў на кітайскую мову. Як практык-перакладчык магу засведчыць, што на мове Купалы і Коласа кітайская паэзія гучыць гэтак жа меладычна і паўнагучна, як і вершы нашых беларускіх класікаў.

***— Што ў вашых планах як сталага, вопытнага перакладчыка кітайскай паэзіі надалей?***

Закаханасць у кітайскую паэзію прыйшла да мяне нечакана — з томікам вершаў Ван Вэя. Я адкрыў для сябе потым многіх і многіх вялікіх паэтаў Кітая, пачуў сэрцам паэтычны накал радка некаторых сучасных творцаў. Не думаю, што гэтак жа нечакана, як прыйшло, маё захапленне кітайскай паэзіяй і сыдзе. Паэзія Кітая мае сутнасную глыбіню, грунтуецца на тых чалавечых каштоўнасцях, якія называюцца вечнымі. І сёння адпусціць яе з абсягаў душы — значна здрабнець духоўна самому. Тым больш калі ўжо грукаецца настойліва Ай Цін — перакладзі!

І калі гэтая кніга з'явіцца — чытач паэзіі па-беларуску шмат новага ў цэлым адкрые пра Кітай. Ай Цін — паэт з асабліва шматпакутным лёсам. Творца, які прайшоў няпростыя выпрабаванні і ўвабраў у сябе шмат што з еўрапейскай паэзіі.

Так. Ай Цін зіхаціць многімі паэтычнымі фарбамі. Ён падобны на вогнішча, што асвятляе ваколіцу...

***— Ці не здаецца вам, што наспеў час пастаянна дзеючага семінара перакладчыкаў кітайскай мастацкай літаратуры ў Беларусі?***

— Справа перакладу ў Беларусі здаўна з'яўляецца саматужнай творчай практыкай. Перакладам займаліся нашы класікі-пачынальнікі — Якуб Колас, Янка Купала, Максім Багдановіч. Іх маладзейшыя калегі таксама лічылі сваім творчым абавязкам далучыцца да гэтай пачэснай місіі. Скажам, з вялікай адказнасцю да перакладу ставіліся Максім Танк і Аркадзь Куляшоў. Былі і ёсць у нас сапраўдныя чыста перакладчыкі — Язэп Семяжон, Юрка Гаўрук, Васіль Сёмуха. Кожны абраў нейкі свой літаратурны маршрут, як Ніл Гілевіч — Балгарыю, Іван Чарота — Сербію. Новы час, безумоўна, адкрывае і новыя магчымасці. Цяпер можна паспрабаваць замахнуцца і на пастаянна дзеючы семінар. І тут можна сапраўды пачаць з Кітая. Намі багата ўжо зроблена ў гэтым кірунку. Мы павінны зберагчы і прымножыць перакладчыцкі вопыт нашых папярэднікаў, якія па праве лічылі, што айчынная літаратура не павінна быць ізаляванай ад астатняга свету.

**Гутарыў Мікола БЕРЛЕЖ**

■ Паслясвяточнае

# ВОСЬ ТАКІ АЖЫЯТАЖ

**Якая ўсё ж немалая наша краіна! Калі, напрыклад, у апошні дзень вялікіх выхадных дзе-небудзь у Мінску ці ў Магілёве мясілі пад нагамі мокры снег з пяском, то ў нас, у Брэсце, было сонечна, суха, тэрмометры паказвалі плюс 12. Пра снег мы даўно забыліся, на дварах прыватнага сектара і дачных участках павылазілі белыя падснежнікі ды паказалася першая нясмелая зелень. У поўдзень на пешаходнай Савецкай вуліцы назіралася даволі шмат народу.**

Чамусьці ўспомніліся фотаздымкі пачатку стагоддзя, перадваенных 40-х менавіта з гэтай вуліцы. Іх цяпер часта публікуюць напярэдадні святкавання 1000-годдзя горада. Дык вось, там гараджане ўсміхаюцца. Думала ў нядзелю: можа, тыя, далёкія ўжо брастаўчане проста пазіравалі фатографу, таму і пакінулі нашчадкам свае бесклапотныя ўсмешкі? Гараджане канца дзясятых XXI стагоддзя выглядалі засяроджанымі і заклапочанымі, нават калі крочылі ў пары са сваімі палавінамі, дзецьмі альбо сябрамі-знаёмымі. Здавалася, яны даўно забыліся, з якой нагоды ім выпалі невялікія канікулы. Толькі адна жанчына ішла з букетам цюльпанаў, якія, хутчэй за ўсё, купіла «па дзяшоўцы» на распродажы. Ішла, паглядвала на свае кветкі і ледзь-ледзь усміхалася. Астатнія ўдзельнікі вясновага праменаду ў асноўным хадзілі з аднаго гандлёвага цэнтра ў другі.

Гэтых самых цэнтраў па вуліцы Савецкай дастаткова. Скажу адразу, хадзіць па крамах я не люблю. Іду тады, калі нешта вельмі трэба купіць. Таму мэтанакіравана прыехала ў адзін з гандлёвых цэнтраў, зайшла ў краму адзення. Здавалася б, звычайны дзень, не аб'яўлялі пра масавыя зніжкі, але што там рабілася — не перадаць. У прымерачныя кабіны — чэргі, да касы — чэргі. Усяго многа, і выбраць тую самую блузку, па якую я прыйшла, аказалася не так проста з-за мноства стэлажоў, паліц, вешалак, на якіх размяшчаецца тавар. І, скажу вам, няма нічога горшага, чым стаяць у паліто і шапцы пры пакаёвай тэмпературы, калі чарга на прымерку амаль не рухаецца. Застаецца разглядаць сваіх вымушаных таварышаў па той самай чарзе. Вось мужык ціха скрозь зубы сварыцца на жонку, што прывалакла яго сюды, нібы раней гэтых ануч у вочы не бачыла. З размовы вынікае, што прыехалі яны з вёскі ці райцэнтра, і, замест таго каб прыемна траціць выхадны, ён павінен парыцца ў гэтай духаце. Перад імі стаяць, відаць, маці з сынам, якія не могуць знайсці паразуменне наконт таго, якую куртку-вятроўку хлопцу лепш купіць, таму іх набралі мо больш за дзясятак. Значыць, прымерка будзе доўгай.

У той чарзе я спачувала незадаволенаму мужу прыезджай кабеты і гадала, чым жа выкліканы такі шопінг-ажыятаж. Пакупныя здольнасці асноўнай часткі насельніцтва апошнім часам як быццам бы не вельмі, а па колькасці гандлёвых плошчаў на душу насельніцтва мы, як вядома, перагналі Парыж. Тым больш што перад святамі заўважаліся чэргі ў прадуктовых магазінах. Тут адно з двух. Альбо, адзначыўшы свята, пайшлі траціць апошнія, як пісаў некалі Оскар Уайльд: «Гэтыя папяросы з залатым абадком страшэнна дарагія. Я куру іх толькі тады, калі па вушы ў даўгах». Ці, як гаварыў гаспадар сядзібы «Каралінскі фальварак Тызенгаўза» Павел Клімук, з якім давялося сустракацца летась: «Умеем мы паплакацца: так няма грошай, так няма грошай, што долары мяняць трэба».

...А мужык той не вытрымаў, не дачакаўся чаргі, каб ацаніць патэнцыйныя абноўкі, сказаў: «Я лепей пайду піва піць». Мабыць, яму хто і пазайздросціў. Добра, калі жонка сама ўсё купіць, потым за руль сядзе, дадому завязе, а там яны разам адсвяткуюць ці проста парадуюцца абновам.

І калі гэты ажыятаж у краме адзення яшчэ можна растлумачыць блізкай вясной, жаданнем абнаўлення, то для вызначэння другога, на жаль, падыходзіць формула «заўсёды і зноў». Знаёмая прадавец невялікай крамы на рагу сказала, што за святочныя дні ў яе купілі 12 скрынь гарэлкі, а звычайна за такі перыяд разыходзіцца тры-чатыры. Вось вам і вынік. У паслясвяточнай зводцы здарэнняў заўважаю дзве амаль аднолькавыя інфармацыі, толькі раёны адрозніваюцца: Кобрынскі і Івацэвіцкі. У першым выпадку выпівалі аднавяскоўцы, потым 56-гадовая нажом ударыла 33-гадовага. У другім — 34-гадовая парэзала сужыцеля, амаль равесніка. Мужчыны ў бальніцы, за іх жыццё, як заўсёды, змагаюцца. Адным словам, пагулялі дзяўчаты. Як і 34-гадовая дама з Пінскага раёна. Праўда, яна нікога не рэзала, а вось што не пакалечыла, сцвярджаць адназначна нельга. Дзяўчына адзначыла жаночае свята з сяброўкамі ў начным клубе, потым села за руль ды паехала. А калі ёй падалі сігнал спыніцца, сама выйшла з машыны і пайшла насустрач супрацоўнікам ДАІ. Яны і падумаць не маглі, што давядзецца канстатаваць 2,7 праміле (прыкладна паўлітра гарэлкі) у жанчыны на 20-м тыдні цяжарнасці. Здзіўленым міліцыянерам яна тлумачыла, што ўсе адзначаюць свята, ну і яна не горшая за іншых. Адным словам, не вытрымала напору ўсеагульнага святочнага алкагольнага ажыятажу.

А ведаеце, як гэтае слова тлумачыў шолахаўскі дзед Шчукар? Хто вельмі даўно чытаў, напомню: дзед вывучаў тлумачальны слоўнік асаблівым чынам. Словы, надрукаваныя вялікімі літарамі, ён разбіраў, а тлумачэнне па прычыне дробнага шрыфту не бачыў, таму прыдумваў сам. На яго думку, напрыклад, «акварэль» азначала добрую дзеўку, а «бардзюр» — нешта накшталт гуляшчай бабы. Дык вось, ажыятаж у яго разуменні падобны на кветкавы луг: «Гэта калі вакол цябе прыгажосць. «Жы» азначае жыві, радуйся на белы свет, ні суму табе, ні маркоты». Вось такога ажыятажу жадаю табе, дарагі чытач, у святле надыходзячай вясны.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении торгов в виде открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Промжилстрой»**

Лот № 1: **Изолированное помещение с инв. № 700/D-98156 – Офис,** расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Пионерская, 12-103, общей площадью 33,6 кв. м, назначение – административное помещение.
***Начальная цена продажи: 24 079,00 бел. рублей с учетом НДС;***
***Сумма задатка 2 407,90 бел. рублей***

| | |
|---|---|
| Продавец | ОАО «Промжилстрой» УНП 700012423, Могилевская обл., г. Могилев, пр-т Шмидта, 55 |
| Расчетный счет для перечисления задатка | Получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X |
| Дата, время и место проведения аукциона | **Аукцион проводится 19 апреля 2018 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, офис Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки». Последний день подачи заявок и внесения задатка: 18 апреля 2018 года до 15.00 |
| Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества | В течение 10 (десяти) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона с победителем заключается договор купли-продажи. Оплата производится на условиях заключенного договора купли-продажи |

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юридические лица Республики Беларусь – копию свидетельства о гос. регистрации, копии учредительных документов, – индивидуальные предприниматели Республики Беларусь – копию свидетельства о гос. регистрации; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц и индивидуальных предпринимателей – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; иностранные юридические лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранные индивидуальные предприниматели – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представители иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованную в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Единственный участник имеет право приобрести объект по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Участник, выигравший торги, уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней после проведения аукциона в соответствии с выдаваемым в день проведения аукциона счетом-фактурой.

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: +375 222 72-41-14, +375 29 624-26-25, +375 44 738-18-99.**

## `ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

Совместное предприятие «Промекс» общество с ограниченной ответственностью информирует юридических и физических лиц о создании объекта долевого строительства.

**Информация о застройщике:**

*Застройщик (Заказчик)* – СП «Промекс» ООО – зарегистрировано решением Министерства внешних экономических связей Республики Беларусь № 30 от 27.02.1997 г. в Реестре общереспубликанской регистрации за № 1295, ЕГР №100349659.

*Адрес застройщика*: г. Минск, ул. Авакяна, 19, помещение 198, комната 1.

*Телефон* (017) 328-50-47, факс (017) 328-55-52.

*Режим работы*: понедельник–пятница с 9.00 до 17.00 без обеда.

Предприятие осуществляет строительство объекта собственными силами и с привлечением субподрядных организаций.

За последние три года предприятием построены: 20-этажный 142-квартирный жилой дом № 8 по генплану (ул. Радищева, 3) – срок строительства 29 месяцев, 170-квартирный 14–15-этажный жилой дом № 6 по генплану (ул. Воронянского, 40) – срок строительства 37 месяцев.

**Информация о проекте:**

Строительство осуществляется в соответствии с условиями решения Мингорисполкома № 2670 от 25 октября 2013 года «Об изъятии, предоставлении земельных участков и разрешении строительства».

Объект долевого строительства – «Строительство многоэтажных жилых домов, не относящихся к категории повышенной комфортности, со встроенными объектами общественного назначения и сносом 1–2-этажных жилых домов в границах улиц Воронянского – Жуковского – Быховской – Радищева». 2-я очередь. Жилой дом № 6 по г/п.

Комплекс состоит из жилого дома, с размещением на 1–2-м этажах встроенных помещений общественного назначения. Конструкция дома – каркасно-блочная. Наружные стены из керамзито-бетонных блоков, внутренние перегородки – из керамзито-бетонных блоков и кирпичной кладки. Наружная отделка – утепление, окраска акриловой краской. Высота типовых жилых этажей – 2,7 м. Отделка квартир и нежилых помещений не осуществляется. Все квартиры имеют лоджии.

Межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, тех. подполье, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в общую собственность дольщиков.

Благоустройство включает озеленение территории, устройство тротуаров, дорожек, размещение площадок отдыха, детских и хозяйственных, устройство плоскостных автостоянок на 35 машиномест.

Вышеприведенные характеристики подтверждены решением КУП «БЕЛГОСЭКСПЕРТИЗА ПО ГОРОДУ МИНСКУ» № 294-60/12 от 30.05.2012 г.

Нормативный срок строительства в соответствии с проектной документацией – 22,3 месяца.

Срок окончания строительства – 10 мая 2018 года.

Жилая часть общей площадью 13266,0 кв. м. Всего квартир 170.

Для заключения договоров долевого строительства предлагаются:

2 административных помещения на первом этаже: № 5 площадью 137,89 кв. м и № 6 площадью 146,13 кв. м стоимостью 1 метра квадратного в эквиваленте 1300 долларов США.

Настоящая проектная декларация действует до момента публикации следующей проектной декларации.

**Застройщиком получены:**

1. Решение Мингорисполкома № 2670 от 25 октября 2013 года «Об изъятии, предоставлении земельных участков и разрешении строительства»;
2. Проектно-сметная документация, прошедшая в установленном порядке гос. экспертизу, заключение КУП «БЕЛГОСЭКСПЕРТИЗА ПО ГОРОДУ МИНСКУ» № 294-60/12 от 30.05.2012 г.;
3. Разрешение на производство строительно-монтажных работ, выданное органом государственного строительного надзора № 2-204Ж-019/13 от 13.02.2018 г.;
4. Свидетельства о государственной регистрации земельного участка № 500/1032-8500 от 25 ноября 2013 г. и № 500/1032-8501 от 25 ноября 2013 г.

## Проведение первых повторных торгов по продаже имущества ООО «Энергостимул»

| № лота | Наименование лота | Начальная цена, руб. (без НДС) | Сумма задатка, руб. | Шаг торгов 5 %, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Станок универсально-фрезерный МН550, инв. № 00000069 | 3 420,00 | 342,00 | 171,00 |
| 2 | Модульное здание без обшивки и утепления 3500х3700х2500 (32,38 кв. м) | 3 366,77 | 336,68 | 168,34 |
| 3 | Модульное здание без обшивки и утепления 3500х3700х2500 (32,38 кв. м) | 3 366,77 | 336,68 | 168,34 |
| 4 | Модульное здание без обшивки и утепления 3500х3700х2500 (32,38 кв. м) | 3 366,77 | 336,68 | 168,34 |
| 5 | Модульное здание без обшивки и утепления 3500х3700х2500 (без крыши) | 2 618,82 | 261,88 | 130,94 |
| 6 | Камеры КСО-210 с релейным отсеком | 3 017,70 | 301,77 | 150,89 |
| 7 | Камеры КСО-210 с релейным отсеком | 3 017,70 | 301,77 | 150,89 |
| 8 | Камеры КСО-210 с релейным отсеком | 3 017,70 | 301,77 | 150,89 |
| 9 | камеры КСО-210 с релейным отсеком | 3 017,70 | 301,77 | 150,89 |
| 10 | Камеры КСО-210 с релейным отсеком | 3 017,70 | 301,77 | 150,89 |
| 11 | Анализатор электрической сети ENA500 | 4 464,61 | 446,46 | 223,23 |
| 12 | Вакуумные выключатели ВБ10-2 | 2 261,38 | 226,14 | 113,07 |
| 13 | Вакуумные выключатели ВБ10-20, на выкатной тележке с комплектами адаптации к К-104М | 3 729,60 | 372,96 | 186,48 |
| 14 | Вакуумные выключатели ВБ10-20, на выкатной тележке с комплектами адаптации к К-104М | 3 729,60 | 372,96 | 186,48 |
| 15 | Вакуумный контактор JCZ57,2/400 | 2 880,00 | 288,00 | 144,00 |
| 16 | Вакуумный контактор JCZ57,2/400 | 2 880,00 | 288,00 | 144,00 |
| 17 | Вакуумный контактор JCZ57,2/400 | 2 880,00 | 288,00 | 144,00 |
| 18 | Система дифференциально-токовой защиты BE1CDS220 | 2 718,00 | 271,80 | 135,90 |

Цена указана без НДС. (УСН)

Местонахождение лотов: **Минская область, г. Вилейка, ул. Шубина, д. 105.**

Торги в электронной форме (далее – торги) будут проведены на электронной торговой площадке WWW.TORGI24.BY: начало – **16 апреля 2018 г**., в 9.00, окончание – 16 апреля 2018 г., в 17.00.

**Письменная заявка на участие в торгах и копия документа, свидетельствующего об оплате задатка, подаются по 13.04.2018 на адрес электронной почты организатора торгов: torgi24@tut.by.**

Задаток на участие по каждому лоту составляет 10 % от его начальной цены и должен быть перечислен по **13.04.2018** на расчетный счет организатора торгов – ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Корженевского, 14, оф. 404, УНП 191514793, р/с BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код (BIC) UNBSBY2X, назначение платежа: задаток по лоту (наименование лота и его номер) для участия в электронных торгах **16.04.2018.**

Организатор торгов: **ООО «Расантехторг»,** тел. +375 (29) 670-30-84.

Продавец: ООО **«Энергостимул»** в лице управляющего ООО «Бизнес-Уэй», тел. +375 (29) 165-33-65.

Лицо, ответственное за хранение имущества: **ООО «Расантехторг»,** тел. +375 (29) 670-30-84.

Ознакомиться с лотами можно в будние дни с 09.00 до 17.00 по месту нахождения лота, предварительно согласовав время прибытия.

Правила и порядок проведения торгов, оформление участия в электронных торгах указаны на сайте Единого государственного реестра сведений о банкротстве www.bankrot.gov.by и на сайте http://www.bellot.by/ **WWW.TORGI24.BY.**

Центр Промышленной Оценки
- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Оршаагропроммаш», Витебская обл., г. Орша, ул. Ленина, 215 |

**Предмет аукциона**

**Лот № 1.** Объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом, расположенные по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Производственный корпус цеха** (здание специализированное для металлургического производства и металлообработки) | 16 006,4 кв. м | 110/С-110941 |
| **Открытый склад металла** (сооружение специализированное складов, хранилищ) | 1 723 кв. м | 110/С-112475 |
| *Составные части и принадлежности: (А)-площадка* | | |
| **Площадка завода металлоконструкций** (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства) | 3 014 кв. м | 110/С-113604 |

***Сведения о земельном участке:*** пл. **2,4736** га предоставлен продавцу для обслуживания производственного корпуса цеха, открытого склада металла, площадки завода металлоконструкций на праве постоянного пользования

**Начальная цена с НДС 20 % – 4 073 544,34 бел. руб.**

**Лот № 2.** Объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом, расположенные по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79

| Наименование (Назначение) | Общая площадь | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Административно-производственный корпус** (здание административно-хозяйственное) | 1 659 кв. м | 110/С-85249 |
| **Автодорога завода** (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства) | 2 358 кв. м | 110/С-113603 |
| **Резервуар для воды** (сооружение специализированное водохозяйственного назначения) | 1 284 кв. м | 110/С-111498 |
| Составные части и принадлежности: резервуар для воды (А) с техническими характеристиками согласно техническому паспорту | | |
| **Корпус нейтрализации** (здание специализированное иного назначения) | 352,7 кв. м | 110/С-111501 |
| *Составные части и принадлежности: кирпичный склад* | | |

***Сведения о земельном участке:*** пл. **1,0677** га предоставлен продавцу для обслуживания и эксплуатации существующих зданий и сооружений комбината на праве постоянного пользования

**Начальная цена с НДС 20 % – 986 242,16 бел. руб.**

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **WWW.CPO.BY**

**Задаток 1 % от начальной цены лота** в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

